ЛІТАРАТУРА і мастацтва



29 красавіка 2005 г. № 17/4304

АНОНС!

Размаітасць тэматыкі і праблематыкі, жанраў і форм сучаснай беларускай літаратуры найвыразней відаць менавіта ў літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Як вылучаюцца з натоўпу буйныя фігуры магутных асоб, так і на агульным "літаратурным" фоне заўважна "выдаюцца" адметныя постаці і арыгінальныя творчыя праекты...

СТАР. 6

Савіч-Заблоцкі атрымаў адпаведную для свайго паходжання адукацыю. Ён быў чалавекам авантурыстычным і прадпрымальным, ініцыятыўным і запальчывым, імпульсіўным і няўжыўчывым. Чаго варты адзін пералік гарадоў і краін, у якіх яму давялося пажыць-пабываць: Вільня, Пецярбург, Варшава, Львоў, Кракаў, Прага, Лейпцыг, Страсбург, Парыж, Брусель, Аўстра-Венгрыя, Германія, Швецыя, Егіпет...

СТАР. 12

Казачная песня



Баядэрка — гэта індыйская танцоўшчыца: жыве ў храме, удзельнічае ў рэлігійных рытуалах або ў святочных імпрэзах. Яна не спявае. Але балет "Баядэрка" нагадвае песню. Экзатычную песню-казку, у якой — індусы, ваяры і нявольнікі, баядэркі і прывідныя цені, заможны раджа і факір, Вялікі брамін і Залаты бажок. Палкае і крохкае каханне, разлік і рэўнасць, здрада, атрутная змяя, схаваная ў кветках... Людзі любяць казкі з вечным сюжэтам і прыгожай музыкай. Нездарма твор кампазітара Л.Мінкуса і балетмайстра М.Пеціпа (паводле драмы індыйскага класіка Калідасы "Сакунтала" і матываў балады В.Ё.Гётэ "Бог ды баядэрка") амаль 130 гадоў не сыходзіць з афіш тэатраў свету. На мінскай сцэне "Баядэрка" не ставілася з 1959-га. І вось — прэм'ера ў Нацыянальным акадэмічным тэатры балета Беларусі, ажыццёўленая харэографам з Пецярбурга П.Сталінскім і яго земляком, даўнім сябрам нашага Вялікага тэатра, сцэнографам В.Окуневым. Разам з дырыжорам М.Калядкам яны імкнуліся захаваць дух класічнага піцерскага балета. Тут "спявае" не толькі мова акадэмічнага танца на пуантах: артысты выказваюцца праз выразныя паставы, красамоўныя жэсты, пластыку "пявучых" рук... У першым жа спектаклі публіка вылучыла вядучых выканаўцаў: Кацярыну і Пятра Борчанкаў, Марыну Вежнавец, Аляксандра Бубера.

Фота К.Дробава
Калаж В.Калініна

Школьнікі — ветэранам

Напярэдадні святкавання шасцідзесяцігоддзя Вялікай Перамогі Рэдакцыйна-выдавецкай установай "Літаратура і Мастацтва" выдадзена кніга "Помним. Гордимся!" (наклад — 3000 асобнікаў).



Змест выдання складаюць конкурсныя сачыненні (на беларускай, рускай і англійскай мовах) школьнікаў горада Мінска пра Вялікую Айчынную вайну. У работах навучэнцаў, як у своеасаблівым люстэрку, адбіваецца галоўнае: сучасная моладзь захоўвае святое святых нашага народа — патрыятызм, найбольш значным складнікам якога з'яўляецца шанаванне гераічнага мінулага сваіх продкаў.

Прадмову да кнігі напісаў Іван Кустаў, Герой Савецкага Саюза, палкоўнік у адстаўцы, Ганаровы салдат 1-й мотастралковай роты 356-га асобнага мабільнага батальёна 120-й Рагачоўскай гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады. У ёй Іван Ільіч прызнаецца, што з вялікім хваляваннем чытаў сачыненні мінскіх школьнікаў пра Другую сусветную вайну. "Мне радасна, што ў сэрцах юных мінчан жыве памяць пра Вялікі Подзвіг іх дзядоў і прадзедаў, — падкрэслівае ветэран, — што яны ведаюць сапраўдную цану таму, што зрабіла пакаленне саракавых для будучых пакаленняў. Дзіцячыя сачыненні кранаюць душу, іх хочацца перачытваць, а некаторыя з іх проста не забываюцца, зноў і зноў усплываюць у памяці".

Такім чынам, гэта выданне з'яўляецца своеасаблівым, адметным падарункам унукаў і праўнукаў тым, хто прайшоў усе пакуты і жахі вайны, змагаўся за іх незалежнасць і мірную будучыню. Тым больш напярэдадні такой значнай для ўсіх даты — 60-годдзя Вялікай Перамогі.

В.К.

У падарунак — успамін. Уласны

Арыгінальны падарунак да Дня Перамогі падрыхтавалі ветэранам нясвіжскія ўлады. Напярэдадні свята састарэлыя воіны павінны атрымаць кнігі, заснаваныя на ўласных успамінах аб вайне.

Ініцыятарам і спонсарам зборніка ў гонар 60-годдзя Вялікай Перамогі выступіла кіраўніцтва Нясвіжскага раённага выканаўчага камітэта. Расповеды амаль трох соцень герояў-землякоў на працягу некалькіх месяцаў збіралі мясцовыя педагогі і сельсавецкія работнікі. А на здымках у зборніку, назва якога — "Паклонімся вялікім тым гадам", — самі аўтары ўспамінаў.

Кніга падрыхтавана да друку ідэалагічнымі работнікамі райвыканкама. Выканаўца заказу — мясцовая друкарня.

І.П.

На вайсковых вучэннях

Цёплы ясны надвячорак... Ціха шумяць сосны вакол вялікай лясной паляны — нібы і яны стаміліся разам з вайскоўцамі за напружаны рабочы дзень вучэнняў. А на паляне — скрозь стаяць і сядзяць салдаты і афіцэры 28-й асобнай механізаванай брыгады. Слухаюць меладычную песню кампазітара Алега Чыркуна, якую ён выконвае сам... Гучаць дружныя апладысменты ўдзячных слухачоў. Артысты і выступоўцы са спецыяльнай канцэртнай брыгады Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь змяняюць адзін аднаго. На імправізаваную сцэну адкрытага кузава грузавіка паднімаюцца Ігар Лучанок, Аляксей Дудараў, Алесь Савіцкі, Яўген Каршукоў... Тут і палымянае слова пра святы абавязак абараняць Радзіму ветэрана Вялікай Айчыннай, лірычныя і патрыятычныя песні, ды вершы, гумар...

У гэты выхадны дзень канцэртная брыгада, якую дасціпна назвалі "франтавой", паспела выступіць яшчэ на Даманаўскім палігоне і ў Баранавіцкім гарнізонным Доме афіцэраў. Усюды артыстаў і пісьменнікаў сустракалі вайскоўцы з незвычайнай цеплынёй і гасціннасцю.

М. ІВАНОЎСКІ

Быль. Боль...

Лекар-мудрэц і вялікі настаўнік — Час. Праз яго мы прызвычаіліся жыць пад "палыноваю зоркай" — ці дамоклавым мечам? — Чарнобыля, ведаем пра катастрафічныя наступствы, звыкліся ці стаміліся думаць пра горшае... І раптам — "У пошуках Чарнобыля". Знаны кінааператар і фотамайстар Юрый Плюшчаў, у асобе якога спалучыліся дакументаліст, мастак і даследчык, называе так выстаўку сваіх работ. Чаму? Адказам — яго просты, сумленны, лаканічны аповед-фотароздум пра тое, што здарылася 19 гадоў таму з прыгожымі палескімі мясцінамі, з людзьмі, якія там жылі, а ўрэшце — з усімі намі. Агляд выстаўкі (зладкаванай пры падтрымцы аддзела інфармацыі, адукацыі і культуры пасольства ЗША на Беларусі, прынамсі, спадарыні Д.Макдоналд, і размешчанай у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.Пушкіна) не абуджае апакаліптычных настрояў, а выклікае ў душы ноткі светлай журбы ды антымістычна-мужнага жадання жыць, перамагаючы боль ад гэтай абязлюдненай, бяздушнай, адчужанай і варожай рэальнасці.

Кіраўнік амерыканскага пасольства Д.Крол, наведаўшы адкрыццё выстаўкі, выказаў добрыя ўражанні, звярнуўшыся да прысутных без перакладчыка — на беларускай мове. Як падкрэсліў наш вядомы кінарэжысёр А.Карпаў, лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта РБ дзеячам культуры і мастацтва, Ю.Плюшчаву ўдалося адчуць парадаксальную жахлівую прыгажосць убачанага ў адзіным на ўвесь свет бязлюдным радыяцыйным экалагічным запаведніку. І гэтая супярэчнасць прыгожага мастацтва фатаграфіі ды трагедыйнасці аб'екта, на ёй адлюстраванага, узрушвае па-сапраўднаму.

С.БЕРАСЦЕНЬ

Фота К.Дробава
На здымку: Ю.Плюшчаў сярод наведнікаў выстаўкі.

Палітра Майстра



Май Данцыг, мастак-філосаф, чуйны да сучаснасці, па-маладому экспрэсіўны, глыбокі знаўца асноў рэалістычнага жывапісу, цудоўны рысавальшчык і каларыст, працуе практычна ва ўсіх жанрах выяўленчай творчасці. Карціны майстра зрабіліся беларускай класікай. Ёсць яны ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, у маскоўскай "Траццякоўцы", у музеях і прыватных калекцыях многіх краін. Сярод вучняў — знаныя Г.Паплаўскі, Л.Шчамялеў, В.Сумараў, А.Бараноўскі, М.Казакевіч...

Нядаўна М.Данцыг, народны мастак Беларусі, прафесар, загадчык кафедры жывапісу БДАМ, справіў 75-годдзе. Уражлівую панараму і сакавітую палітру яго жывапісу прадставіла персанальная выстаўка ў Палацы мастацтваў. Захапляе зусім новае вырашэнне гарадскога краявіду: "Мой Мінск", "Мой горад старажытны, малады", "Песня пра Мінск", "Мінск прачынаецца", "Верхні горад"... На вялікага памеру палотнах паўстае абагульнены і шматгранны вобраз сталіцы. І кажуць, пасля Данцыга сказаць нешта новае пра Мінск моваю жывапісу вельмі складана, яго карціны пра родны горад зрабіліся знакавымі для Беларусі. Вялікую Айчынную ён памятае па-свойму, бо 11-гадовым хлопчыкам, сярод бежанцаў, пакідаў родны Мінск, у які ўжо ўваходзілі акупанты, а ў часе эвакуацыі шмат маляваў, і гэты занятак зрабіў яго ў літаральным сэнсе карміцелем сям'і. Станкова-манументальныя карціны М.Данцыга на ваенную тэму — арыгінальныя і нетрадыцыйныя ("Партызанскае вяселле", "Беларусь — Маці партызанская", "І помніць свет уратаваны...", філасофскі нацюрморт "Аб Вялікай Айчыннай..." ды інш.).

"Тая дзяржава, у якой усе грамадзяне будуць умець маляваць, пераўзыдзе усе іншыя дзяржавы ва ўсіх галінах", — упэўнены М.Данцыг, яркі паслядоўнік высокіх традыцый мастацтва.

Галія ФАТЫХАВА

Фота забяспечана аўтарам

Беларускія татары і Вялікая Перамога

Кіраўніцтва беларускіх татар і вучоны-гісторык Ібрагім Канапацкі правялі ўжо дзесяць міжнародных навукова-практычных канферэнцый. Дзейсны вынік іх працы — шматлікія тамы навукова-папулярных зборнікаў.

Апошняя з канферэнцый праходзіла ў шасцідзесятыя ўгодкі вызвалення роднай Беларусі, а праводзілі яе Міністэрства культуры РБ, Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, Сусветны кангрэс татар, Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай спадчыны "Чышма", Беларускае грамадскае аб'яднанне татар "Зікр уль — Кітаб".

Чарговы зборнік расказвае аб удзеле цюркскіх народаў і народаў Каўказа ў Вялікай Айчыннай вайне. У ім 22 артыкулы, больш чым двух дзесяткаў аўтараў з Мінска, Віцебска, Гродна, Баранавіч, Рэспублікі Татарстан, Казахстана. Адказным рэдактарам, як і арганізатарам самой канферэнцыі, з'яўляецца кандыдат гістарычных навук Ібрагім Канапацкі.

Міхась МАЛІНОЎСКІ, г. Баранавічы

Памяць Салігорскага раёна

У Доме культуры гарадскога пасёлка Старобін адбылася прэзентацыя гісторыка-дакументальнай кнігі-хронікі "Памяць. Салігорскі раён", выдадзенай БЕЛТА.

Шматтомныя серыі пра гарады і раёны Беларусі стваралася як энцыклапедычныя выданні па рашэнні ўрада нашай краіны. Доўгім быў шлях кнігі да чытачоў Салігоршчыны. Пачынальнікам і арганізатарам складання матэрыялаў выдання быў пісьменнік Леанід Шырын, шмат працы прыклаў галоўны метадыст арганізацыйна-метадычнага цэнтра Міністэрства інфармацыі РБ Міхась Башлакоў, а завяршаў укладанне галоўны рэдактар раённай газеты "Шахцёр", заслужаны журналіст Аляксандр Пляшэвіч.

Кніга асвятляе багатую гісторыю зямлі нашых продкаў ад Тураўскага і Слуцкага княстваў, ВКЛ, Рэчы Паспалітай ды Расійскай імперыі. Значна дапамог матэрыяламі дырэктар краязнаўчага музея імя В.Каржа ў вёсцы Хорастава, кандыдат гістарычных навук Міхаіл Цуба. Ён падрыхтаваў артыкулы пра нашага асветніка Яна Цадроўскага з мястэчка Пагост і паэта Уладзіслава Сыракомлю, які доўгі час жыў у вёсцы Яскавічы Салігорскага раёна.

Сярод матэрыялаў выдання — падзеі Першай сусветнай вайны, рэвалюцыйная сітуацыя, усталяванне Савецкай улады, калгаснае будаўніцтва.

Значная частка кнігі прысвечана перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Тут прыведзены спісы партызан, падпольшчыкаў, воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, мірных жыхароў — ахвяр нямецкіх акупантаў.

Сяргей ЯКІМОВІЧ

СМІ і нацыянальная культура

За апошнія гады рынак сродкаў масавай інфармацыі значна пашырыўся. Так, напрыканцы 2004 года ў Міністэрстве інфармацыі было зарэгістравана 190 праграм радыё- і тэлевяшчання.

На гэтым рынку дамінуючае становішча, як па ахопе насельніцтва рэспублікі, так і па аб'ёме вяшчання, займае Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія. У яе склад уваходзіць 16 рэспубліканскіх і рэгіянальных тэле- і радыёпраграм. "Сярод іх тэлеканал "Лад" і радыёканал "Культура" з'яўляюцца асноўнымі праваднікамі беларускай культуры і мастацтва, — лічыць намеснік загадчыка аддзела электронных СМІ Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ніна Раеўская. За 2004 год ЗАТ "Другі нацыянальны тэлеканал" і ЗАТ "Сталічнае тэлебачанне" значна пашырылі сваю прысутнасць на інфармацыйным полі рэспублікі: "АНТ" — у аб'ёме праграм, "СТБ" — па тэрыторыі распаўсюджвання і колькасці праграм: гэты працэс нельга лічыць завершаным. Сёння на рынку інфармацыі працуюць 107 аператараў кабельнага тэлебачання, у сетках якіх ад 7 да 40 тэлеканалаў краін бліжняга і далёкага замежжа, у тым ліку 21 канал Расійскай Федэрацыі, якія складаюць канкурэнцыю айчынным тэлеканалам.

"Мэтай айчынных электронных сродкаў масавай інфармацыі з'яўляецца як інфарміраванне аб працэсах, што адбываюцца ў рэспубліцы, так і фарміраванне свядомасці насельніцтва, прывіванне інтарэсаў да нацыянальнай культуры і яе традыцый, — адзначыла Ніна Раеўская. — З мэтай прапаганды беларускай культуры і мастацтва на радыё і тэлебачанні Міністэрствам культуры пры садзеянні Міністэрства інфармацыі складзены спіс новых твораў беларускіх кампазітараў, якія рэкамендаваны для запісу на Беларускім радыё. Распрацаваны палажэнні па пашырэнні паказу на ўсіх дзяржаўных тэлеканалах спектакляў і канцэртных праграм вядомых айчынных тэатральных, музычных, харэаграфічных калектываў і выканаўцаў".

У выніку праведзенай працы актывізавалася дзейнасць беларускіх электронных сродкаў масавай інфармацыі.

У межах сваіх паўнамоцтваў Міністэрства інфармацыі рэгулярна прадстаўляе матэрыялы службам інфармацыі тэле- і радыёвяшчальных арганізацый аб агульнарэспубліканскіх мерапрыемствах, распрацоўвае планы паказу сацыяльна значных мерапрыемстваў, якія накіроўваюцца для рэалізацыі на тэле- і радыёкампаніі дзяржаўнай і недзяржаўнай формы ўласнасці. За адзінаццаць месяцаў гэтага года на адрас рэспубліканскіх тэлерадыёкампаній было накіравана 87 даручэнняў, 27 з якіх тычыліся пытанняў культурнай тэматыкі.

Так, на "Першым нацыянальным тэлеканале" і тэлеканале "Лад" найбольш значныя падзеі культурнага жыцця краіны знайшлі адлюстраванне ў інфармацыйных і інфармацыйна-аналітычных перадачах, а таксама ў спецыяльных рэпартажах і відэафільмах.

Каб удасканаліць прапаганду беларускай культуры ў электронных сродках масавай інфармацыі ў межах 8-й Міжнароднай спецыялізаванай выставы "СМІ ў Беларусі" для кіраўнікоў рэгіянальных тэлерадыёкампаній Міністэрства інфармацыі арганізавала "круглы стол" на тэму "Культура мовы і прафесійны ўзровень вядучага — заклад поспеху тэле- і радыёканала". У гэтым мерапрыемстве прынялі ўдзел выкладчыкі кафедры тэле- і радыёвяшчання факультэта журналістыкі БДУ, Акадэміі мастацтваў, спецыялісты Белтэлерадыёкампаніі.

У межах прапаганды беларускай культуры Міністэрства інфармацыі сумесна з Белтэлерадыёкампаніяй ажыццявіла шэраг задач па інфармацыйным забеспячэнні мерапрыемстваў XIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". У эфіры беларускіх і расійскіх тэлеканалаў шырока адлюстроўваліся падзеі фестывалю. Акрамя таго, пры садзеянні Міністэрства інфармацыі тэлеканал "Мір" трансліраваў асноўныя мерапрыемствы фестывалю на краіны СНД, Балтыі і іншыя. Пры садзеянні Міністэрства інфармацыі выдавецтва "Мастацкая літаратура" наладзіла дзелавыя кантакты з Белтэлерадыёкампаніяй і ЗАТ "Другі нацыянальны тэлеканал". На Першым нацыянальным тэлеканале, а таксама тэлеканалах "Лад" і "АНТ" было праведзена 15 тэлесустрэч з удзелам кіраўніцтва выдавецтваў і аўтарамі. А на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё і на радыёканале "Культура" выйшла ў эфір 57 праграм.

Перспектыўны кірунак прапаганды беларускай культуры і мастацтва Міністэрства інфармацыі бачыць у рэалізацыі праекта "Беларусь-ТБ". "Мы распрацоўваем пытанне аб бязвыплатным прадастаўленні архіўных матэрыялаў, тэлеперадач, мастацкіх і дакументальных кінафільмаў РУП "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм", РУП "Беларускі відэацэнтр", ЗАТ "Другі нацыянальны тэлеканал" і ЗАТ "Сталічнае тэлебачанне", — падкрэсліла Ніна Рыгораўна. Распрацоўваецца таксама пытанне перадачы праў Белтэлерадыёкампаніі на такія матэрыялы для выкарыстання ў эфіры спадарожнікавага тэлеканала "Беларусь-ТБ". Гэта будзе садзейнічаць прапагандзе беларускай культуры і мастацтва за мяжой.

У галіне прапаганды маладзёжнай музычнай культуры і мастацтва, Міністэрства інфармацыі падтрымлівае ініцыятывы "Першага музычнага тэлеканала", дзейнасць якога накіравана на папулярызацыю сучасных беларускіх аўтараў і выканаўцаў. "У той жа час у беларускай музычнай відэапрадукцыі адсутнічаюць якасныя відэакліпы беларускіх артыстаў", — лічыць Ніна Раеўская.

Паводле даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам культуры пры ўдзеле Міністэрства інфармацыі распрацавана і праходзіць узгадненне Праграма прапаганды музычнага мастацтва Рэспублікі Беларусь на 2005 — 2010 гады.

Варта адзначыць і шэраг недахопаў у працы тэле- і радыёканалаў. "Не заўсёды падрыхтаваныя праграмы адпавядаюць патрэбнаму узроўню. Афармленне студый, стыль і мова вядучых пакідае жадаць лепшага", — падкрэсліла Ніна Рыгораўна. Паводле яе слоў, на фоне развіцця расійскіх каналаў адчуваецца адсутнасць уласнай кінавідэапрадукцыі, серыялаў айчыннай вытворчасці для паказу на беларускіх каналах, цыклаў праграм пра шэдэўры беларускага дойлідства і гістарычную спадчыну, цыклаў праграм для моладзі, пазнавальных і забаўляльных перадач уласнай вытворчасці, новых аўтарскіх праграм, а таксама прэзентацыйных праграм пра Беларусь і іх запісаў на VHS і DVD-носьбітах для выкарыстання як унутры, так і за межамі краіны.

Марына ЦЯРЭШЧАНКА

Калаж В. Калініна, А. Смаляка

Калі душа знаходзіць душу

Аптымізацыя міжасабовых зносін, асабісты і прафесійны рост студэнтаў — тэма навуковай дыскусіі, што адбылася на днях у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка.

Вось ужо два гады ў гэтай навучальнай установе пры кафедры ўзроставай і педагагічнай псіхалогіі факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій працуе праблемная лабараторыя "Прастора магчымасцей".

— У наш мітуслівы і імклівы час вельмі важна, калі хтосьці вас уважліва выслухае, — адзначыла выкладчыца кафедры і кіраўнік лабараторыі Алена Казленя. — І ўнікне ў вашы думкі шчыра і па-добраму. Многім з нас не хапае менавіта раскошы чалавечых адносін.

Выкладчыкі і студэнты паставілі перад сабою мэту стварыць на псіхалагічных занятках такую вобразную прастору, дзе б кожнага чулі, а не проста слухалі, не глядзелі на чалавека, а бачылі яго і разумелі. Бо сувязі паміж людзьмі — гэта перш за ўсё ўзаемадзеянне, узаемаразуменне, узаемаўплыў. А як гэтыя складаемыя працуюць, удзельнікі дыскусіі даведаліся з прагучаўшых выступленняў. Адзін з дакладчыкаў прызнаўся, што практычныя заняткі ў лабараторыі дапамаглі яму перамагчы ўнутраны страх выказваць адкрыта свае думкі. Псіхалагічныя трэнінгі спрыяюць студэнтам усвядоміць сваё "я", развіваюць іх творчы патэнцыял, фарміруюць педагагічнае майстэрства.

— У нашай маленькай лабараторыі, калі сустракаецца група, можна сказаць, пашыраюцца сцены, — расказала Алена Казленя.— І тады адкрываюцца сусветы: душа знаходзіць душу. Вядома, гэта не псіхалагічны тэрмін, але менавіта ў такіх абставінах людзі лепш разумеюць адзін другога. Самыя дзівосныя рэчы на свеце — самыя простыя. У асноўным мы вывучаем чалавека звонку, а не глыбіню ягона "я", унікальнага, непаўторнага, якое не паддаецца ніякаму разліку. Таму мы ставім перад сабою задачу аб'яднаць вонкавае і ўнутранае ў чалавеку.

Пачуўшы гэта, міжволі падумалася: студэнтам, якія займаюцца ў праблемнай лабараторыі, у будучым лягчэй будзе знаходзіць кантакт з дзецьмі, успрымаць глыбінныя жыццёвыя працэсы, набываць прафесіяналізм.

Раіса МАРЧУК

На здымках: Алена Казленя; удзельнікі дыскусіі.

Фота К. ДРОБАВА

Ты не адзінокі, сірата!

Напярэдадні Дня сям'і, які афіцыйна будзе адзначаны 15 мая, у Мінскім абласным адзяленні рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Беларускі дзіцячы фонд" сабраліся тыя, для каго паўнаважкая сям'я пакуль што толькі мара. Гэта — дзеці-сіроты, якія прыехалі сюды разам з апекунамі.

"Ужо трэцім разам мы збіраемся з вамі штогод у такім складзе, — звяртаючыся да гасцей, зазначыла старшыня абласнога аб'яднання Галіна Пранько. — Добрыя людзі, сябры з далёкай Італіі, прапанавалі чарговую дапамогу ў выглядзе грашовых сродкаў. Наша дзяржава ўважліва ставіцца да праблем сваіх маленькіх грамадзян, якія па розных прычынах засталіся без бацькоў. Значную падтрымку ў гэтым напрамку аказваюць ёй рознага кшталту грамадскія арганізацыі, найбольш вядомая з іх — Беларускі дзіцячы фонд".

Дзякуючы яго актывістам, дваццаць круглых сірот з розных куткоў Міншчыны, якіх гадуюць апекуны, тры гады таму займелі італьянскіх спонсараў. А дванаццаць малышоў з сямейных дзіцячых дамоў атрымліваюць дапамогу ад добразычліўцаў са Злучаных Штатаў Амерыкі. Дарэчы, новых маленькіх сяброў у Мінскай вобласці іншаземцы мелі магчымасць выбраць самі, азнаёміўшыся з анкетамі і фотаздымкамі дзяцей, якія даслалі ў іх краіны супрацоўнікі дзіцячага фонду.

...Лісты ад беларускіх хлопчыкаў і дзяўчынак будуць з нецярпеннем чакаць у далёкім замежжы.

Інеса ПЕТРУСЕВІЧ

ПАЭЗІЯ, выпрабаваная вайной

Паэт Мікола Аўрамчык — з пакалення тых беларусаў, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны ўсталі на абарону нашай радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У псіхалагічна-складанай экзістэнцыйнай сітуацыі на мяжы жыцця і смерці яскрава выяўляецца сутнасць характару чалавека, паказваюцца сапраўдныя адносіны да навакольнай рэчаіснасці і людзей. Стан душы чалавека, яго думкі і пачуцці найбольш ярка адлюстроўваюцца ў паэзіі — самым суб'ектыўным родзе літаратуры.

Перачытваю кнігу выбраных твораў М.Аўрамчыка "Агледзіны" (1969), знаходзячы новыя адценні думак і пачуццяў пісьменніка. У яго творчасці ваеннага і пасляваеннага перыяду, акрамя вершаў лірычных (пераважна грамадзянска-патрыятычных, філасофскіх і прыродаапісальных), сустракаюцца і лірааэпічныя (сюжэтныя вершы, балады, паэмы). У творах дзейнічаюць і рэфлексуюць лірычны герой-паэт і лірычныя персанажы: паранены салдат, які знаходзіцца ў шпіталі, матросы, здолеўшыя вызваліцца з варожага палону і мірныя людзі, якія шануюць памяць пра загінуўшых. Яго "журналісцкая", "рэпартажная" паэзія — гэта мастацкая фактаграфія, лірычныя замалёўкі, глыбокія філасофскія развагі і шчырыя патрыятычныя пачуцці. Яго паэзія ваеннага часу без асаблівых фармалістычных пошукаў (напрыклад, М.Аўрамчык не эксперыментуе з цвёрдымі формамі верша), бо на фронце кожны дзень мог стаць апошнім, тут ужо не да штучных эстэцкіх гульняў. Таму яго экзістэнцыйна-напружаныя вершы былі сродкам выжывання і ратавальнага катарсісу.

Тэма непарушнай франтавой дружбы гучыць у творы "Трое", дзе распавядаецца пра трох таварышаў, двое з якіх з варожага палону выносяць параненага сябра, спадзеючыся, што той, "адчуўшы волю, раптам ажыве". Шчырая ўзаемадапамога, братэрства з рускімі ваярамі, суперажыванне параненым і ўшанаванне памяці па загінуўшых — менавіта гэтыя маральныя якасці беларускіх салдатаў дапамаглі ім выстаяць і здабыць перамогу ў вайне. Мірныя людзі дагэтуль шануюць памяць пра загінуўшых у імя перамогі, гэта памяць — вечная.

М.Аўрамчык прысвячае вершы пісьменнікам, лётчыку Гастэла, маці. Не толькі сама вайна сталася ў тыя гады трагедыяй, але і смерць нашага класіка: "Пра смерць Купалы ў тыя дні // Пачулі мы пад Старай Русай. // Знялі пілоткі ў цішыні // І масквічы, і беларусы". Усенародная любоў да беларускага песняра выявілася ў жаданні ўшанаваць яго памяць у выглядзе помніка — адразу ж, у мірны час, калі над Беларуссю ўжо не будуць разрывацца гарматы:

Яшчэ гушчар стагнаў ад мін,
Свінцом зямлянкі абдавала,
А ўжо нам сніўся новы Мінск
І з бронзы выліты Купала

"У той дзень"

У вершы "Памяці Міколы Сурначова" М.Аўрамчык успамінае сябра-паэта, з якім "дзялілі на дваіх // Салдацкі хлеб" і які гераічна загінуў у 1945 годзе падчас вызвалення Польшчы ад фашыстаў. Твор "Анкета" аўтар прысвячае Янку Брылю, які быў у нямецкім палоне, спачувае Івану Антонавічу і падзяляе боль яго ўспамінаў.

На здымку: М. Аўрамчык і І. Лучанок

Паэт звяртаецца таксама да самага блізкага (генетычна і душэўна) чалавека — да маці, удзячны за яе жыццезахавальныя перажыванні і ратавальныя малітвы: "Ты і ў снах наведвала мяне, // На вайне прапаўшага без весткі. // Мо таму і ў страшным пекле выжыў я, // Як з мяне ні здзекваліся чэрці, // Бо я ведаў, родная мая: // Не перажывеш маёй ты смерці" ("Не трывожся гэтак, маці, аба мне...").

Беларуская прырода, як і людзі, таксама шмат пакутавала падчас вайны: "тут палінялі без пары бярозы // І пасівелі на зямлі лаўжы", "не раз яго [лясны гушчар] снарады карчавалі, // Пастрыг свінец чубы кашлатых хвой... // Карэнне ў глебе бомбы пакрамсалі", і гераічная сасна стаіць "знявечаная мінаю". Але ідэя неўміручасці роднай прыроды (а падтэкстава — і беларускага народа) насуперак смерцям, выяўлена праз жыццесцвярджальны вобраз маладых раслін на папялішчы: "Чуваць, як знізу парасткі тугія // Свідруюць пласт абвугленай зямлі" ("Прыдарожны гушчар"). Прырода — не проста фон для разважанняў і пераменлівых настрояў лірычнага героя і персанажаў, яна суперажывае чалавеку, абараняе яго, дапамагае яму знайсці ў сабе душэўныя сілы супрацьстаяць ваенным выпрабаванням і нават — перамагчы.

Родная прырода валодае гаючымі ўласцівасцямі. Метафара М.Аўрамчыка "Стоптанае жыта на палёх // Адзвінела песняй недапетай..." ("Балада аб матросах", 1942) нагадвае чытачу аб шматлікіх чалавечых ахвярах і як сэнсава-непадзельная пара "жыццё-жыта" пазней (у 1965 годзе) асацыятыўна паўторыцца ў радках верша А.Пысіна: "Забыта многае ў жыцці, // З дарогі змецена і змыта. // Мне ў жыта хочацца ўвайсці, // Мне вечнасцю здаецца жыта".

Людзі — ахвяры вайны, якія прынялі на свае плечы цяжкія, незаслужаныя выпрабаванні, тытанічнымі намаганнямі духу ўрэшце перамагаюць, — і аднаўляецца сацыяльная і маральна-этычная справядлівасць: мірныя людзі варты свабоднага шчаслівага жыцця. Мікола Аўрамчык псіхалагічна-дакладна апісвае стан салдата, які, прайшоўшы праз усю вайну, страціўшы сяброў, напярэдадні перамогі, праганяючы ворага да Берліна, заплакаў. Заплакаў, хоць прынята казаць, што мужчыны не плачуць, "...І дрэвы, і цагляныя будынкі // Аж задрыжалі у яго слязе" ("Салдацкая сляза"). Слёзы спрыяюць катарсісу — ачышчэнню душы, аднаўленню сіл для далейшага, ужо мірнага, жыцця. Паказ слёз праз дэталь — дрыжанне навакольнай прыроды, няпэўнай у сваіх абрысах, перад вачыма змагара, — удалы прыём паэта — тонкага псіхолага і ўважлівага назіральніка.

Меў рацыю Г.Гейнэ, калі пісаў, "як ні жудасна вайна, усё ж яна выяўляе духоўную веліч чалавека, які кідае выклік свайму наймацнейшаму спадчыннаму ворагу — смерці". Лірычны герой М.Аўрамчыка таксама гатовы самаахвярна памерці, каб яго нашчадкі жылі пад мірным небам (як блізка гэты парыў судакранаецца з ідэяй "Vita brevis, patria aeterna"!):

Хай сабе загіну я ў змаганні,
Толькі дзеці слухалі б штогод
Галубоў бяспечных буркаванне
І раслі без гора, без клапот

"Галубы"

Лірычнаму герою твора "Уначы перад наступленнем" (г.зн. і яго прататыпу-аўтару, бо яго вершы пераважна аўтабіяграфічныя) цыганка наваражыла смерць ад вады ў маладым узросце. Але лёс быў літасцівы да Міколы Аўрамчыка. Улюбёны ў маці і Радзіму сын, добры бацька, праніклівы лірык, тонкі псіхолаг, глыбокі мысляр... Той, хто, з яго слоў, жыве "ў імя таго, што застанецца пасля". Перачытваючы "Агледзіны" Міколы Аўрамчыка, схіляюся перад чысцінёй, дабрынёй і сумленнасцю яго паэтычнай душы...

Таццяна БАРЫСЮК

На ўрачыстай сустрэчы з пісьменнікамі, ветэранамі вайны міністр абароны Рэспублікі Беларусь Л. Мальцаў уручыў юбілейны медаль "60 год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" і Васілю Гурскаму, які жыве ў вёсцы Стальбоўшчына на Уздзеншчыне. Васіль Рыгоравіч заслужыў гэты медаль не толькі ўдзелам у Вялікай Айчыннай вайне, але і сваімі кнігамі, у якіх ён расказаў пра ўласны баявы шлях і сяброў.

"Бягуць гады, як вада ў рацэ. Старэюць ветэраны, паміраюць былыя камандзіры брыгад і атрадаў, старэйшыя партызаны", — такімі словамі завяршае толькі што выдадзеную кніжку "Пушчы і дубровы славаю шумяць" пісьменнік Васіль Гурскі. І гэта сапраўды так. Усё менш застаецца ўдзельнікаў і сведкаў вызначальных для нашай гісторыі гадоў Вялікай Айчыннай. У далейшым будзе намнога цяжэй адкрываць абставіны найвялікшага сусветнага процістаяння.

Можа таму, так спяшаецца Васіль Рыгоравіч, былы кулямётчык, падрыўнік партызанскага атрада імя Чапаева, пакінуць нашчадкам і свае веды і сведчанні перажытага часу вайны. Больш за трыццаць гадоў збірае ён і падсумоўвае звесткі пра грозныя ваенныя гады, апрабоўвае напісанае ў газетных і часопісных артыкулах, асобных брашурах і зборніках.

З адлегласці ўспамінаў

У згаданай вышэй кніжцы В. Гурскі выявіў сябе карпатлівым добрасумленным даследчыкам. Абапіраючыся на сваю выдатную памяць, успаміны партызанскіх сяброў, дакументальныя публікацыі стварыў усебаковы партызанскі летапіс. Папярэдняй руплівай працай яго творы пазбаўлены асобных недакладнасцей і непаўнаты. Вось так і атрымалася прэзентуемае адметнае фактаграфіяй, моцнае сваёй праўдзівасцю і глыбокім побытавым адлюстраваннем выданне. Яго змест пацвярджаецца сотнямі імёнаў, дат, канкрэтнай адраснай пасылкай. Таму кніга выклікае давер.

Гэты твор пісьменніка пра тых, хто выстаяў у бязлітаснай барацьбе, прайшоў праз неверагодныя выпрабаванні і вярнуўся да мірнага жыцця. Ён і пра тых, хто не дажыў да дня Вялікай Перамогі. У той жа час гэта шчырая і кампетэнтная справаздача аўтара найбольш адказны і складаны адрэзак свайго жыцця. Пры стварэнні кнігі ён перажыў мінулае яшчэ раз, прапусціў перажытае праз сваё збалелае сэрца. У яго вайна — не толькі перамогі, але і бясконца жудасны страх.

Аўтарская рэканструкцыя драматычных падзей не прэтэндуе на ўсеахопнасць. Апісанне амаль не выходзіць за межы Міншчыны, за тэрыторыю добра вядомага аўтару Наднямоння — Уздзеншчыны, Капыльшчыны, часткова Дзяржыншчыны і Случчыны. Кніга-даследаванне ахоплівае перыяд ад першай ваеннай бяссоннай ночы да апошняй, падвёўшай рысу вайне на наднёманскай зямлі, аўтаматнай чаргі. "Фашысцкая навала адкочвалася ў сваё логавішча, ля вытокаў Нёмана прагучала апошняя аўтаматная чарга — ліхалецце адыходзіла ў нябыт, зніклі бліскавіцы з перунамі. Наднямонне вярталася да мірнай стваральнай працы".

Што адметна — у гэтым шматгадовым творы Васіля Гурскага ўдала і вельмі арганічна спалучаецца строгая дакументальнасць з аўтарскай выдумкай. У ім добра паказаны дух і агульны настрой людзей таго часу, іх агульнанароднае праяўленне. Твор пісьменніка суровы, у той жа час пранікнуты мяккім добрым гумарам.

У кнізе раскрыты малавядомыя падзеі вайны на Міншчыне — абставіны Лаўскага бою ў снежні 1942 года, знішчэння ўздзенскай Хатыні — вёскі Астравок і яе жыхароў у сакавіку 1943 года, падрабязнасці разгрому нямецкага атрада з групай высокапастаўленых фашысцкіх эмісараў партызанамі атрада "Буравеснік" М. Мармулёва на шашы Шацк — Валяр'яны ў чэрвені 1943 года, лёс перайшоўшых на бок партызан шэрагу былых нямецкіх саюзнікаў.

Нямала старонак кнігі прысвечана дзецям. У ёй яны актыўныя ўдзельнікі партызанскага руху, сувязныя. Яшчэ б! Пасля заканчэння сваёй вайны на тэрыторыі Венгрыі Васіль Гурскі прысвяціў далей жыццё школе. Ён і зараз піша творы для дзяцей.

Кніга напісана лёгка, даступна, у размоўнай падачы, простым сялянскім словам. Логіка падзей прыцягвае і захапляе. Месцамі стыль выкладання высакапарны, пераходзячы ў пафасны, часам набывае нават апалагетычны адбітак. Аднак такое ўзвышэнне не псуе агульную патрыятычную падачу матэрыялу. Што было — тое было! Васіль Гурскі не адракаецца ад сваёй ідэйнай пазіцыі, ад у пэўнай ступені ідэалагічных прыёмаў уздзеяння на чытача. Але ён не збіваецца тым не менш на пераможны тон. Згадвае выпадкі несправядлівасці і жорсткасці з боку партызанскіх камандзіраў.

Аўтар спрабуе асэнсаваць і нашу будучыню. Ён піша: "З трывогай за будучае дажываюць апошнія ветэраны Вялікай Айчыннай вайны свой зямны век, але з надзеяй і верай у мудрасць і разважлівасць маладога пакалення".

Узяўшы ў рукі кніжку "Пушчы і дубровы славаю шумяць", хочацца дачытаць яе да апошняй старонкі. Гэта невялічкая партызанская энцыклапедыя Міншчыны павінна заняць дастойнае месца на паліцах бібліятэк і прыватных кнігазбораў. У сувязі з набліжэннем шасцідзесяцігоддзя з дня заканчэння вайны яе актуальнасць не падлягае сумненню. Яна будзе прыцягваць да сябе ўвагу і ў далейшым.

Уладзімір КІСЯЛЁЎ

На здымку: В. Гурскі



У гэту нядзелю праваслаўныя вернікі адзначаюць адно з найсвятлейшых царкоўных святаў — Вялікдзень.
Выпала так, што каталікі сустрэлі Пасху больш чым на месяц раней. Пра тое, чаму так адбываецца, гаворка пойдзе ніжэй. Сама назва "пасха" мае больш даўнюю гісторыю, чым думаюць некаторыя, і атаясамліваецца са старазапаветным святам, якое азначае "ісход", "выхад" яўрэяў з Егіпта: вызваленне ад егіпецкага рабства. Але ж у такі дзень амаль дзве тысячы гадоў таму адбылася вельмі значная падзея ў адносінах паміж Богам і людзьмі — уваскрэсенне Ісуса Хрыста.

Свята святаў

У першыя стагоддзі ад Нараджэння Хрыстова хрысціяне ў розных краінах святкавалі Пасху не ў адзін і той жа час, бо дата вызначалася па-рознаму. Адны сумяшчалі Вялікдзень са Звеставаннем, другія карысталіся разлікамі іудзеяў і адзначалі свята разам з імі, трэція мелі свае арыгінальныя методыкі разлікаў. Усё гэта прыўносіла неспакой у царкоўнае жыццё. Бо, напрыклад, калі ў адных краінах ужо сустракалі вялікае свята, у іншых яшчэ толькі рыхтаваліся да яго, прадаўжаўся вялікі пост.

Так цягнулася да 325 года, калі адбыўся Першы Усяленскі (Нікейскі) сабор, скліканы імператарам Канстанцінам Вялікім. На ім было пастаноўлена "адзначаць Святую Пасху ўсім хрысціянам у адзін дзень". А асноўныя прынцыпы вызначэння даты былі наступныя: святкаваць Пасху пасля дня вясенняга раўнадзенства, у нядзелю, якая наступае пасля першай поўні.

У якасці разлікаў дня Пасхі прынялі рашэнне выкарыстоўваць пасхалію, распрацаваную александрыйскімі вучонымі. Александрыйская пасхалія падпарадкоўвалася юліянскаму календару, якім на той час паўсюдна карысталіся, і скарыла ўдзельнікаў сабору сваёй універсальнасцю ды прастатою. З яе дапамогай можна было вызначыць дзень Пасхі на любы год без ужывання складаных астранамічных разлікаў.

У аснову разліковай формулы пасхаліі была закладзена дата 21 сакавіка — дзень вясенняга раўнадзенства падчас Першага Усяленскага сабору. Астраномы Александрыі, якія распрацавалі пасхалію, ведалі, што юліянскі каляндар не зусім супадае з сонечным астранамічным годам і дзень дваццаць першага сакавіка не заўсёды будзе днём вясенняга раўнадзенства. Але на мэце пасхаліі, якая пасля сабору стала абавязковай для ўсіх хрысціянскіх цэркваў, было не дасягненне астранамічнай дакладнасці, а стварэнне простага агульнадаступнага сродку вызначэння дня Пасхі. Таму дзень вясенняга раўнадзенства, які закладзены ў формуле, з'яўляўся не строга астранамічнай велічынёй, а ўмоўнай, таксама як і прысутнае ў разліковых формулах паняцце "поўня".

Урэшце, пасля Першага Усяленскага сабору з'явілася адзінства сярод хрысціянскіх цэркваў і Вялікдзень пачалі адзначаць паўсюдна ў адзін і той жа дзень.

Але гэта адзінства было парушана рымскім Папам Грыгорыем XIII, які ў 1582 годзе зацвердзіў новы каляндар, у якім, у адрозненне ад юліянскага, парушалася цыклічнасць. Александрыйскую пасхалію стала немагчымым выкарыстоўваць у новым календары, і каталікі правялі пасхалічную рэформу. У ёй паняцці "вясенняе раўнадзенства" і "поўня" ў формулах разліку дня Пасхі сталі не разліковымі велічынямі, а — астранамічнымі з'явамі. Так як сёння разліковыя і астранамічныя з'явы не супадаюць, дык і Пасху ў розных краінах зноў пачалі святкаваць у розны час. Але ёсць выключэнне, калі Вялікдзень заходні і ўсходні супадаюць, — разліковая і астранамічная поўні павінны адбыцца на адным тыдні.

Прыйшоўшы на нашы землі з Візантыі, хрысціянства прынесла і рытуал святкавання Пасхі. Тыдзень перад святам прынята называць Вялікім, ці Страсным. Асабліва выдзяляюцца апошнія дні: Вялікі Чацвер — дзень духоўнага ачышчэння, Страсная Пятніца — напамін пра пакуты Ісуса, Вялікая Субота — дзень смутку, і, урэшце, — Светлае Уваскрэсенне Хрыстова.

У праваслаўных хрысціян існавала шмат звычаяў і рытуалаў, прымеркаваных да дзён Вялікага тыдня. Так, Вялікі Чацвер традыцыйна называюць "чыстым", прычым не толькі таму, што ў гэты дзень вернік імкнецца ачысціцца духоўна, прычасціцца, але і па народным звычаі ачышчэння вадой — купанне ў рацэ, возеры ці абліванне ў лазні да ўзыходу сонца.

У чацвер таксама прыбіралі ў хаце: усё дасканала вымывалі, вычышчалі, бялілі печы. У некаторых мясцовасцях збіралі і спальвалі ядлоўцавыя галінкі, акурвалі імі жытло і хлеў. Лічылася, што дым ядлоўцу абараняе чалавека і жывёлу ад хвароб і нечысці. Існавала павер'е, што адкладзеныя ў страсны чацвер яйкі, якія з'ядалі на Пасху, таксама абаранялі ад хвароб, а іх шкарлупінне, закапанае ў зямлю там, дзе пасецца жывёла, ахоўвае яе ад суроку. Яшчэ адзін звычай — асвячаць соль і ў ноч на чацвер ставіць на стол разам з хлебам.

Таксама з гэтага дня пачыналі рыхтавацца да свята: фарбавалі яйкі, выпякалі пасхі (боханы белага хлеба). Фарбаванне яек, дарэчы, мае сваю адметную гісторыю і звязана з асобай Марыі Магдаліны, калі яна прыйшла да імператара Тыберыя. Марыя жыла бедна, не мела асабліва чаго прынесці з сабою. Але да высокіх чыноў не было прынята прыходзіць без падарунка, і яна ўзяла простае курынае яйка. Магдаліна прыйшла да Тыберыя з пасхальнай весткай "Хрыстос Уваскрос", аднак імператар быў язычнікам і прамовіў, што чалавек не можа ўваскрэснуць, таксама як і гэтае яйка ніколі не стане чырвоным. Пры апошніх ягоных словах яйка афарбавалася ў чырвоны колер.

Асвянцонае яйка за пасхальным сталом з'ядаюць першым, перад усімі астатнімі стравамі. (Да слова, пасхальны стол рабілі багатым, у заможных гаспадароў падавалі сорак восем розных страў па колькасці дзён посту.) Яйкі даюць родным, сваякам і суседзям, калі ідуць у госці. Мяркуюць, што пасвянцонае яйка мае магічныя ўласцівасці. Лічылася, што яно нават можа патушыць пажар, калі яго кінуць у агонь, таму і захоўвалі яго за абразамі на ўсялякі выпадак. Пасхальным свянцоным яйкам перад першым выганам гладзілі па хрыбціне хатнюю жывёлу, каб яна не хварэла і мела гладкую поўсць.

Ёсць на Вялікдзень яшчэ адна загадкавая з'ява, сапраўднае цуда, якое немагчыма патлумачыць ніякімі фізічнымі законамі, — Дабратворны іерусалімскі агонь. Ён штогод з'яўляецца ў Храме Уваскрасення, што знаходзіцца над пячорай, дзе быў пахаваны Ісус Хрыстос. Кожны год у Вялікую Суботу ў гэтым храме збіраюцца тысячы людзей. Праваслаўны патрыярх апранае адзіную рызу і не можа пранесці з сабой ні запалкі, ні запальнічку, заходзіць у пячору і пачынае маліцца. Праз нейкі час па храме пачынаюць мільгацець блакітныя маланкі-сполахі і запальваюць раскладзеную на Госпадавай труне вату. Святар падпальвае пукі свечак (па трыццаць тры ў кожным) і перадае іх вернікам праз спецыяльную адтуліну. Цікава, што гэты агонь не пячэ і мае цудадзейную сілу. З Храма Уваскрасення ён развозіцца па ўсім свеце.

Пасха святкуецца сем дзён, а сам тыдзень называецца "Светлай Пасхальнай Сядміцай". Адпаведна і дні тыдня завуцца: Светлы Панядзелак, Светлы Аўторак і г.д.

Адметна, што першую Пасху новага тысячагоддзя ўсе хрысціяне свету, каталікі і праваслаўныя, святкавалі ў адзін дзень. На жаль, такое супадзенне не вельмі частая з'ява: так адбываецца толькі шэсць разоў на дзевятнаццаць год. У астатнія гады Вялікдзень у заходніх дзяржавах сустракаюць на тыдзень раней за праваслаўныя краіны, а нярэдка прамежак часу паміж пасхамі складае больш за месяц, як сёлета.

Адзіны дзень святкавання Пасхі ў нечым сімвалічная падзея, знак адзінства ўсяго хрысціянскага свету, які даўно раскалоўся на розныя канфесіі і групы, большасць з якіх сёння нават цяжка назваць цэрквамі. Таму і пытанне адначасовай сустрэчы Вялікадня — справа пра адзінства заходняга і ўсходняга хрысціянства, а значыцца і Праваслаўнай ды Каталіцкай Цэркваў.

Дарэчы, спроба ўзгадніць пасхалію прадпрымалася ў 1997 годзе па ініцыятыве Сусветнага савета цэркваў. З гэтай нагоды ў сірыйскім горадзе Алепа збіралася спецыяльная канферэнцыя. Але дамовіцца ніяк не атрымалася: праваслаўныя як і раней мяркуюць абапірацца на юліянскі каляндар, а каталікі — на грыгарыянскі. Па кампраміснай прапанове — устанавіць фіксаваную дату Пасхі — таксама не прыйшлі да згоды, бо яна не адпавядае евангелічнаму аповеду.

Як бы там ні было, нам, як заўсёды, застаецца спадзявацца на лепшае. Бо надыходзіць Пасха — галоўная падзея для праваслаўных хрысціян і самае вялікае праваслаўнае свята. У гэты дзень вернікі адзначаюць збаўленне ўсяго чалавецтва праз Ісуса Хрыста ад цёмных сілаў і дараванне ім вечнага жыцця. Віншуем ўсіх са светлым святам — Вялікднём!

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота забяспечана аўтарам

Мікола ЗАХАРАНКА

На Вялікдзень

Певень на страху ўзляцеў
І "Хрыстос васкрэс!" прапеў.
З ім згадзіўся чорны грак:
"Гэта праўда! Гэта так!"

А малюсенькі жучок
узмасціўся на сучок,
паглядае на аблокі,
шэпча: "Госпадзі Высокі!"
І вышэй па дрэве лезе:
"Зум-зум-зум!
Хрыстос васкрэсе!"

Сёння шэрыя ваўкі
на слабейшых не палююць.
"Сёння, — кажуць, — дзень такі,
што й драпежнікі святкуюць!"

Нават бацька мой сякеры
сёння ў рукі не бярэ,
адчыняе з хаты дзверы,
кажа: "Свята на дварэ!"

Увайшла матуля ў хату,
абняла мяне і тату,
тройчы нас пацалавала
І, вясёлая, сказала:
"Калі шчасцейка такога,
светлага дзянька святога
даў нам Божа дачакацца, —
то давайма разгаўляцца".

Заспявалі птушкі ў лесе:
"Чык-чырык!
Хрыстос васкрэсе!"
Адказаў паважна лес:
"Сапраўды! Хрыстос васкрэс!"

Размаітасць тэматыкі і праблематыкі, жанраў і форм сучаснай беларускай літаратуры найвыразней відаць менавіта ў літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Як вылучаюцца з натоўпу буйныя фігуры магутных асоб, так і на агульным "літаратурным" фоне заўважна "выдаюцца" адметныя постаці і арыгінальныя творчыя праекты...

Адметныя постаці і арыгінальныя праекты

"Полымя" № 4

Памяркоўна-мудрымі, філасафічнымі радкамі паэтычных твораў Уладзіміра Марука сустракае чытача чарговы нумар "Полымя". Вершы, напоўненыя элегічнымі развагамі, самазаглыбленай аналітыкай настройваюць чытача на меланхолію і вымушаюць далучыцца да роздумаў аўтара пра кругабег жыцця, стасункі з бліжнімі, Вечнасць... Тым жа, хто не надта любіць бавіць час у развагах пра "тленнасць быцця", а аддае перавагу бадзёраму аптымізму, параім перагарнуць старонкі часопіса і "настроіцца" на іншую эмацыйную хвалю.

Найперш прыхільнікаў дасціпнага гумару прывабіць аповесць-фарс Сяргея Давідовіча "Пярэзвы". У цэнтры сюжэта — гісторыя пра вясковае вяселле і традыцыйную сялянскую завядзёнку "пярэзвы", калі сваты, "каб умацаваць пародненасць", па чарзе запрашаюць адныя другіх у госці. У творы дзейнічаюць надзвычай каларытныя персанажы, маўленне якіх утрымлівае безліч трапных народных выслоўяў, застольных тостаў, жартаў і каламбураў. Камічнасць герояў узмацняюць элементы буфанады, анекдатычнасць сітуацый выдатна падфарбоўвае гратэскныя характары. Гэтыя "Пярэзвы" хоць адразу на сцэну — атрымаецца, несумненна, цудоўная гумарыстычная пастаноўка.

Сваё паэтычнае асэнсаванне існасці прэзентуюць чытацкай увазе Уладзімір Скарынкін і Уладзімір Мазго. Эстэтыку творчасці, этычны кодэкс духоўнасці паэзіі Аляксея Коршака, чый творчы шлях перапыніла Вялікая Айчынная вайна, асэнсоўвае ў рубрыцы "На паверцы — імёны" Казімір Камейша.

Нізка лаканічных празаічных твораў Алеся Масарэнкі аб'яднана назвай "Аповеды". Прынамсі тут і пачуваешся калі не суразмоўцам, дык слухачом. Гэтаму ўражанню спрыяе і натуральная эмацыйная нязмушанасць аповедаў, своеасаблівая стылёвая аўтэнтычнасць, уласцівая гутарковаму маўленню. Розныя па тэматыцы гісторыі, нібыта ўзноўленыя з нататніка, датычацца падзей ваенных і пасляваенных часоў ("Пакармілі салдацікаў...", "Двойчы вязень", "Пісьмы"), непасрэдных і запамінальных жыццёвых сітуацый ("Воўчы трафей", "Спадар Ніхто", "Друкавалка") ды і проста колішніх уражанняў, выкліканых да мастацкага ўвасаблення вярэдзівам часу ("Асцярожная рыба", "На золку", інш.).

Успамінам асабістага знаёмства з Янам Скрыганам прысвечана эсэ Андрэя Федарэнкі "Сечка-4". Аўтар шчыра засведчыў, што творчасць Яна Скрыгана магутна паўплывала на яго, колішняга мастака-пачаткоўца: "Адчуванне было, нібыта мяне ўзялі за руку і вывелі з цёмнай, непралазнай гушчэчы, дзе я безнадзейна блукаў, на сонечную паляну, адкуль ужо рукой падаць і да жаданай цупкай дарогі". Вядома, дзеля таго, каб сказаць добрае слова пра чалавека, спецыяльная нагода непатрэбная. Але ж сёлета, калі мы адзначаем 100-годдзе з дня нараджэння гэтага выдатнага майстра нашай прыгожай пісьменнасці, удзячных і прыхільных успамінаў пра Яна Скрыгана прагучыць, безумоўна, асабліва багата. Тым не менш, эсэ А. Федарэнкі, — гэта сапраўднае сведчанне вялікай павагі да старэйшага сябра-творцы, да яго шчодрага таленту і духоўнай велічы.

Публікацыі з рубрыкі "Навука" прадстаўлены інтэрв'ю М. Міхайлава з У. Цалка, старшынёю Камітэта па праблемах вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь "З трывогай за лёс чалавечы". Своеасаблівым працягам гэтай гутаркі стаўся артыкул вядучага навуковага супрацоўніка Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка Таццяны Дзярабінай "Прыроды вечнай чараванне". Доктар філалагічных навук, прафесар Іван Штэйнер засведчыў сваю сардэчную адданасць роднай "alma mater", Гомельскаму дзяржаўнаму універсітэту, у артыкуле "Слаўлю крыніцу, з якой піў ваду".

Янка Сіпакоў дзеліцца з чытачамі жыццёвымі назіраннямі ў эсэ "Нашы хаты". Здавалася б, такая банальная рэч як чалавечае жытло — у кожнага сваё, зробленае і абсталяванае ў адпаведнасці з індывідуальнымі запатрабаваннямі і густам, але ж як арыгінальна развіта гэтая тэма ў філасофскім асэнсаванні мастака... Тут размова не толькі пра нашыя беларускія хаты, а хутчэй пра нацыянальную ментальнасць, пра адметнасць беларускага характару і светапогляду.

У артыкуле "Вочы поўныя жыцця..." з раздзела "Крытыка і літаратуразнаўства" маецца магчымасць далучыцца да развагаў Ю. Шчукі пра малую прозу Вячаслава Адамчыка. У. Гніламёдаў дзеліцца ўражаннямі і меркаваннямі пра паэзію Віктара Шніпа ў артыкуле "У пошуку новага светаадчування". Публікацыя Л. Галубовіча "Рыцар паэзіі" — гэта шчыры і пранікнёны дыялог з чытачом пра асобу і творчасць Алеся Пісьмянкова.

"Маладосць" № 4

Гутаркай галоўнага рэдактара Раісы Баравіковай з намеснікам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь У. Дражыным "Кніга — найвышэйшы здабытак чалавечай мудрасці" пачынаецца гэты нумар часопіса. Нельга не пагадзіцца з ключавою думкаю размовы: "Нягледзячы на развіццё інфармацыйных тэхналогій, кніга заўсёды застанецца галоўнай крыніцай ведаў".

У рубрыцы "Да 60-годдзя Вялікай Перамогі" працягваецца публікацыя твораў сталічных школьнікаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Тут прадстаўлены і паэтычныя, і празаічныя жанры, але агульная адметнасць усіх публікацый — гэта кранальная пачуццёвасць. Было б па меншай меры дзіўным вышукваць мастацкую дасканаласць і вобразную эстэтыку ў наіўных дзіцячых радках, тут навідавоку гранічная шчырасць і цеплыня інтанацый...

Побач з творамі юных літаратараў рубрыка аднаўляе і старонкі айчыннай класікі, прапануючы ўвазе чытачоў вершы славутага ваеннага летапісца А. Пысіна.

П'еса Уладзіміра Федасеенкі "У нашы семнаццаць" прысвечана моладзі, якой давялося сталець і выпрабоўваць уласныя характары ва ўмовах ваеннай рэчаіснасці.

Арыгінальнае вызначэнне "кінараман", якое займеў дэтэктыў Максіма Клімковіча і Уладзіміра Сцяпана "Тэолаг", — гэта, відаць, дадатковая прастора для чытацкай філасофіі. Дзея, разгорнутая аўтарамі, бярэ пачатак яшчэ ў напалеонаўскія часы. Спешліва адступаючы, Банапарт страчвае таямнічы скарб — абоз сышоў пад лёд і патануў у балотнай прорве. Вакол гэтага скарбу віруюць падзеі сучаснасці. Дэкарацыі (маляўнічыя ландшафты, старажытны касцёл, іншую эстэтыку правінцыйнага гарадка) ледзь не ўвесь час ахутвае туман. Сюжэт захапляе дынамікай, мноствам таямніц і неардынарных дзейных асоб — побач са звычайнымі міліцыянтамі тут шчыруюць святары, байкеры і нават містычныя істоты. Гойсае са старонкі на старонку прывідны вершнік на белым кані (нібыта адлучаны ад "Дзікага палявання..."), жудасна шчэрыць пашчу "буйны, кудлаты, шэра-чорны, бы выкачаны ў попеле" сабака ў сталёвым ашыйніку (ці не той самы, што стаўся "пракляццем роду Баскервіляў"?), злосна гудуць пчолы-забойцы... У адпаведнасці з традыцыяй "кінараман" перарываецца "на самым цікавым"... Будзем чакаць наступнай серыі.

Цікавымі матэрыяламі прадстаўлена ў часопісе рубрыка "Культура". Знаёмства са Святланай Скамарохавай, аспіранткай Інстытута літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, якая з'яўляецца аўтарам і стваральнікам англамоўнага сайта пра культуру Беларусі, прапануецца ў артыкуле І. Клімковіч "Адкрыццё "невядомай" краіны". За стварэнне гэтага сайта і за публікацыі, прысвечаныя перакладам беларускай паэзіі на англійскую мову і Вялікай Айчыннай вайне, у 2004 годзе С. Скамарохава атрымала ганаровы дыплом і прэмію за лепшую публіцыстыку. А ў артыкуле "Мая цудоўная Беларусь..." сама С. Скамарохава расказвае пра асобу і творчую дзейнасць аўтара дзевяці кніг перакладаў беларускай паэзіі на англійскую мову Уолтэра Мэя.

У гэтым нумары часопіса Павел Гаспадыніч прэзентуе новую гумарыстычную рубрыку "Залаты графамон", у якой будуць змяшчацца ўрыўкі з празаічных і паэтычных твораў беларускіх пісьменнікаў (як ужо сталых, якія зарэкамендавалі сябе ў літаратуры, так і маладых, чыя творчасць толькі-толькі набірае ўзлёт). Першая падборка творчых "перлаў" дае падставы меркаваць, што рубрыка будзе мець сваю карысць, ва ўсякім разе, прымусіць аўтараў больш пільна асэнсоўваць "вобразную метафарычнасць" уласнай думкі.

"Нёман" № 4

Артыкулам Эдуарда Скобелева "Мысли о строительстве белорусской нации" сустракае чытача чарговы нумар часопіса. Аўтар вядзе рэй з чытачом пра набыткі і перспектывы ў развіцці дзяржавы.

Гутаркай галоўнага рэдактара часопіса Ніны Чайкі са старшынёю Віцебскага аблвыканкама Уладзімірам Андрэйчанкам разгортваецца падборка матэрыялаў выпуску "Витебская тетрадь". Гэтая размова датычыцца і гісторыі, і прамысловай вытворчасці, і культурных традыцый, якімі ганарыцца Віцебшчына. Своеасаблівым працягам дыялога сталіся далейшыя матэрыялы названай рубрыкі — паэтычныя творы віцебскіх аўтараў Алега Салтука, Тамары Красновай-Гусачэнкі, Ніны Давыдзенкі, Мікалая Намеснікава... Асобнай увагі з гэтага сімвалічнага сшытка заслугоўвае раздзел "Впервые в "Нёмане", дзе цэлым шэрагам публікацый прадстаўлены паэтычны цыкл "Голоса Витебщины".

Пра плённую творчую дзейнасць Віцебскага абласнога літаратурнага клуба "Сустрэча" расказвае яго старшыня, пісьменнік і журналіст Барыс Беляжэнка.

Празаічныя творы тут прадстаўлены двума апавяданнямі Г. Катлярова, эпіцэнтрамі якіх сталіся падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Лаканічныя гісторыі дэманструюць жудасныя ракурсы трагедыі... Бясспрэчна, вайна не мае літасці, яна заўсёды нясе з сабою гора, слёзы, нішчыць і калечыць чалавечыя лёсы... Яшчэ адным доказам таму сталася і "навейшая" вайна, якая ўвайшла ў хронікі часу пад назвай "Чачэнская". Менавіта драму гэтай вайны асэнсоўвае В. Строкін у творы "Реквием по двадцать пятому".

Вядома, што Віцебск здаўна славіцца ў свеце сваімі знакамітымі мастакамі. Пра сучаснага жывапісца, скульптара, графіка Юрыя Зуева расказвае ў артыкуле "Листая альбомы художника" Міхась Пазнякоў. Аўтар публікацыі адзначае: "Работы Юрия Зуева свидетельствуют о том, что он — автор поистине талантливый, а потому находится в постоянном мучительном поиске ответов на многие животрепещущие проблемы нашего бытия".

У рубрыцы "Литературная критика" змешчаны публікацыі Наталлі Салаўёвай. Артыкул "Светлый привкус воспоминаний" аўтар прысвяціла паэзіі Вольгі Русілкі, а ў матэрыяле "Образы детства и юности" аналізуе вершы Г. Барысава з кнігі "В порыв небесной чистоты". Гэтыя рэцэнзіі, дзе дадзены высокія ацэнкі творчаму майстэрству землякоў, з'яўляюцца своеасаблівым падсумаваннем "Витебской тетради".

Часопіс працягвае друкаванне фрагментаў дакументальнай аповесці М. Кадзета "Тайны скорбного лета" (пачатак быў у №№ 7- 8, 2004 г.). Аматараў творчасці М. Салтыкова-Шчадрына, несумненна, зацікавіць артыкул М. Герасімовіча, прысвечаны творчасці славутага рускага класіка. Генадзь Кісялёў дзеліцца з чытачамі часопіса сваімі расчараваннямі — ад паэзіі Н. Батраковай, А. Лебедзевай і В. Багун у матэрыяле "Поэзия...и тексты". Заметкі пра літаратурную творчасць У. Ліпскага пад назвай "Возвышение человека" змясціў у "Нёмане" Ю. Гусеў.

Думаецца, кожны аматар мастацтва слова знойдзе, чым задаволіць свой літаратурны густ у гэтых красавіцкіх часопісах. Чыя постаць ці праект найбольш прыцягальныя — меркаваць чытачу...

Лада АЛЕЙНІК

Запрашэнне да сумоўя

Каторы дзень хаджу пад уражаннем ад прачытанай кнігі, што і для мяне трохі дзіўна, бо не надта часта выпадае такая нагода. Тым больш, нашым здэтэктыўленым і абтрылераным часам. "Каб ад кнігі зарадзіцца такім пачуццём, што не дае спакою, не выветрываецца, то ўжо занадта!" — можа сказаць "спешчаны" дэтэктывамі ды трылерамі (найперш невысокай якасці творамі, а тымі, што для электрычак — у кнігах на адно прачытанне) чытач. Ну і хай сабе. А я вось прызнаюся, што эмацыйнае ўздзеянне прачытанага трымае ў палоне ўжо колькі дзён.



Гаворка ідзе пра новы раман Наталлі Батраковай "Площадь Согласия". Пуцёўку ў жыццё дало яму мінскае недзяржаўнае выдавецтва "Кавалер Паблішэрс", якое і адкрыла гэтага незвычайнага аўтара-празаіка, калі ў 2001 годзе выдала першы раман "Территория души" ажно ў дзвюх кнігах. Акрамя таго, гэтым творам Наталлі распачалася серыя "Новы раман новага стагоддзя". Выдавецтва і яго кіраўнік Канстанцін Хацяноўскі, безумоўна, рызыкавалі, калі браліся за такі амбітны праект. Аўтара на той час па сутнасці ніхто не ведаў. Калі ж зірнуць на біяграфію Наталлі, то і сапраўды можна засумнявацца: ці справіцца аўтар са сваім жаданнем (ці мо патрэбай?) — распачаць сталую літаратурную дзейнасць менавіта з рамана, на што адважваюцца не ўсе прафесійныя аўтары?

На наша шчасце, памылкі не адбылося. Хутчэй, наадварот: раман атрымаўся, выдавецтва, што называецца, патрапіла ў "дзесятку". Адразу пасля выхаду першай кнігі рамана "Территория души" чытачы літаральна засыпалі пісьмамі і званкамі і выдавецтва, і кнігарні з адным адзіным пытаннем, просьбай і нават патрабаваннем: калі, нарэшце, будзе працяг? Другая кніга выйшла і мела гэткі ж поспех. Давялося рабіць дадатковы тыраж.

А неўзабаве за першым раманам з'явіўся новы — "Площадь Согласия". І таксама ў дзвюх кнігах. Пакуль што выйшла першая, а сітуацыя паўтараецца: чытач з нецярпеннем чакае працягу.

І гэта радуе. Найперш якасцю напісанага аўтарам. Пасля — тым, што, аказваецца, можна не страціць магчымасць здзіўляцца. І яшчэ таму, што вяртаецца тое першаснае прызначэнне кнігі, дзеля якога і стараюцца яе стваральнікі — ад аўтара да выдаўцоў — прымусіць хоць аднаго чытача адчуць асалоду ад прачытанага, даць яму надзею, паказаць, што жыве яшчэ на свеце дабро і прыязнасць, чалавечнасць узаемаадносін, шчырасць і спагадлівасць. Што менавіта яны перамагаюць, бо жыццё ж не стэрыльнае, хапае ў ім і бруду, і злосці, і нявер'я, і здрады. Ды ўсё адно, на мой погляд, важна — што перамагае і ў імя чаго.

Ахінутае шчырасцю і прачуласцю аўтара, вылучанае з яго неабыякавай і чуйнай душы, пазначанае чалавечай мовай, без выкрунтасаў, непатрэбнага сюсюкання, знарочыстага агрублення стылю, напісанае Наталляй падаецца тым магнітным полем, якое прыцягвае да сябе ўсё новых чытачоў. Значыць, сённяшняму чытачу патрэбны не толькі (а мо не столькі?) трылеры, дзе кроў і смерць забіваюць усе мастацкія адзнакі. Ці не таму зараз набыло папулярнасць песеннае рэтра, што спрагненая душа просіць наталення сапраўдным мастацтвам? Дзякаваць Богу для беларускай літаратуры "сучасна-модна-папулярная" пошасць яшчэ не стала звыклай. Хоць нельга сказаць, што беларускія аўтары замкнуліся ў сваім асабістым свеце.

У большасці сваёй наша прыгожае пісьменства не перастае быць менавіта такім, хоць і наступае на яго магутны і агрэсіўны кніжны акіян, які ўсё большым дзевятым валам аднадзённічыны навальваецца з усіх бакоў, цісне не толькі на рынак, але і на густы чытача. І ўжо часам не зразумець, дзе гаворка пра сапраўдны сэнс чалавечых узаемаадносін, а дзе падробка, імітацыя, фон для грубай і пашлаватай "аўтарскай выявы", "аўтарскага погляду", "аўтарскай самарэалізацыі".

Такія вось думкі навеяў апошні раман Батраковай "Площадь Согласия". Сумысля не стаўлю азначэння "пісьменнік", бо фармальна Наталля не з'яўляецца пакуль што членам нашага творчага саюза. Ды гэты прыклад яшчэ раз сведчыць, што літаратурнае, як, дарэчы, і ўсякае іншае майстэрства вызначаецца не чырвоным пасведчаннем, не колькасцю "корачак" творчых саюзаў, а тым дарам, што даецца Богам. Таму можна лічыць гэтае маё слова публічнай рэкамендацыяй Наталлі Батраковай для ўступлення ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Новы раман Н. Батраковай прысвечаны студэнцтву, той зваблівай пары маладосці, калі і жывецца напоўніцу, і кахаецца асабліва шчыра, і характары выяўляюцца з усім юнацкім максімалізмам, і прыцірка да рэальнага жыцця бывае асабліва балючай.

Бясспрэчна, што маладосць, студэнцтва — гэта найперш каханне, якое, аднак, не заўсёды становіцца перашкодай на шляху для засваення ўсяго вопыту размаітага жыцця. Н. Батракова расказвае пра студэнтаў адной беларускай тэхнічнай вышэйшай навучальнай установы. У рамане, як і належыць, перапляліся розныя аспекты жыцця, розныя адносіны да яго, сутыкаюцца розныя характары. Аднак аўтару ўдалося знайсці той адэкватны настрой, закрануць тую чуллівую плынь, якая адразу знаходзіць водгук.

Але не толькі студэнцкім жыццём напоўнены старонкі рамана. Аўтар выпрабоўвае сваіх герояў і сённяшнімі жыццёвымі неспадзяванкамі, калі патрабуецца мабілізаваць не толькі колішні студэнцкі вопыт, а і напружыць сілы, каб адолець нягоды. Адны характары студэнтаў, бацькоў, выкладчыкаў, іншых людзей сталага веку выпісаны больш грунтоўна і скрупулёзна. Іншым выпала менш раманнага месца. Некаторыя пазначаны толькі пункцірна. Аднак практычна кожны з герояў запамінаецца.

Магчыма, аўтар у нечым спяшаецца, нечага не раскрывае дастаткова пераканаўча, але ў чым нельга адмовіць Н. Батраковай, дык гэта ў стварэнні адметных і цікавых персанажаў, да таго ж яна пазбягае назойлівай дыдактычнасці і маралізатарства. Яе героі не святыя, жыццё іхняе зусім не бясхмарнае, а часам нават памаладому вельмі сумбурнае. Не бездакорныя яны і ў паводзінах, нават з недаравальнымі заганамі. Але яны — жывыя людзі. І гэтым падкупляюць чытача. А калі ўлічыць, што Наталля ўмее ставіць герояў у нязвыклыя, здараецца, "крутыя", як бы сказалі сённяшнім часам, абставіны, умее так закруціць сюжэт, што ён трымае ў напружанні і змушае адольваць старонку за старонкай, каб хутчэй даведацца: а што далей, як выблытаюцца героі з цяжкіх сітуацый, то становіцца зразумелай чытацкая цікаўнасць да рамана. Але за паспешнасцю чытання не губляецца ўвага да мовы. Наталля ўдала знаходзіць моўныя сродкі, адэкватныя сітуацыі, умела карыстаецца словам.

У празаічных творах прысутнічае моцная лірычная настраёвасць. Мушу прызнацца: я крыху саграшыў, калі напачатку пісаў, што Наталля пачала з рамана — яна ўжо была вядомая чытачам як паэт. У гэтым жа выдавецтве выйшлі два яе паэтычныя зборнікі. Кнігі мелі добрыя водгукі, бо вызначаюцца шчырасцю, лірычнасцю, непасрэднасцю пачуцця і тым даверлівым тонам, які робіць чытача прылучаным да перажыванняў аўтара, заклікае да сумоўя і дае гэткую шчаслівую магчымасць мець яго. Наталля і дагэтуль піша вершы, пра што сведчыць яе зборнік "Сто сорок жизненных мгновений", які пабачыў свет ў мінулым годзе. Дарэчы, кожны раздзел рамана "Площадь Согласия" пачынаецца своеасаблівым паэтычным уступам, дзе ў скандэнсаваным выглядзе перадаецца настрой менавіта гэтай часткі твора.

А чаму назва гэткая — "Площадь Согласия"? Аказваецца, на самай справе ёсць такая плошча ў Парыжы. А героі рамана трапляюць і ў гэтую еўрапейскую сталіцу, сёй-той з іх нават працу там займеў. Але назва мае і сімвалічны сэнс. Якім бы цяжкім і складаным ні было жыццё, якія выпрабаванні ні выпадалі б на долю чалавека — надзвычай важна знайсці сваю плошчу згоды, натрапіць на ўзаемнасць, адчуць і зразумець, што ты ў свеце не адзін. А гора, нават самае пякучае, падзеленае з некім, не такое ўжо і цяжкае. Радасць жа, падтрыманая і зразумелая іншымі, становіцца яшчэ больш важкай і прыемнай.

Анатоль БУТЭВІЧ

Наталья Батракова. Площадь Согласия. Книга первая. Серия «Новый роман нового века». Минск, «Кавалер Паблишерс ИООО», 2005

ВЫДАННІ

У зборнік рэчыцкага пісьменніка **Анатоля Караленкі "Радуга "черного золота"** ўвайшло каля ста казак, створаных за трыццаць гадоў. Палова з іх прысвечана экалогіі. Гэта кніга — падарунак вытворчаму аб'яднанню "Беларуснефть", у якім аўтар адпрацаваў шмат гадоў.

Паэтка з Маладзечна **Ніна Захарэвіч** выдала ўжо чацвёрты зборнік вершаў **"Расінка на дрэве"**, які прысвяціла Радзіме, сталым людзям і моладзі, сваім дзецям і ўнукам.

Маладая пісьменніца **Югася Каляда** дэбютавала празаічным зборнікам **"Галоўная памылка Афанасія"**, творам, што ўвайшлі ў яго, уласціва незвычайнае спалучэнне рэальнасці і фантасмагорыі, а героі кнігі — равеснікі аўтаркі — дваццацігадовыя хлопцы і дзяўчаты.

Павал Змітрук выдаў паэтычны зборнік **"Хінжка"**. Паэта хвалюе драматызм лёсу беларускага народа, роднага краю, ён выражае сваю грамадзянскую пазіцыю, знаходзіць арыгінальную вершаваную форму і стыль.

Кніга-даведнік **"Падарожжа па Беларусі:** Гарады і гарадскія пасёлкі" пад укладаннем **Вольгі Князевай** запрашае больш глыбока пазнаёміцца з гісторыяй гарадоў і пасёлкаў Беларусі, адчуць непарыўнасць сувязей паміж мінуўшчынай краіны і сённяшнім днём.

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

Дым

Семак просяць галубы,
Змерзлі верабейкі.
Павярнула дым з трубы —
Ён бухматы нейкі.

У дыму логіка свая:
"Куды вецер — туды й я".

* * *

Ці сонца, ці печка, ці батарэя,
Ці зыркае вогнішча каля ракі —
Люблю іх бясконца!
І ўсё, што не грэе,
Здаецца, па шчырасці,
марным такім...

* * *

Лепей не валодаць,
чым згубіць,
Лепей адысці,
чым заняволіць.
Лепей прыхапіць чужога болю,
Чымся свой на некага
ўзваліць.

* * *

Надакучыла быць слабою,
Надакучыла быць
з табою.
І колькі б нясмеласць ні мучыла,
Саступаць усім
надакучыла!

Сон

Паводка сніцца.
Ў роспачы стаю:
Ўсё заліло,
хістаецца масток...
А хлопчык нейкі (ўнучак ці сынок?)
Упарта не бярэ руку маю...

Ларысе Геніюш

У атачэнні пошасці жыла,
Здавалася: усе навокал шпікі.
Хапала ёй і ў цемрыве святла,
Бо абразоў вакол свяцілі лікі...

Уладзіміру Караткевічу

Ягоных кніг баяўся сон,
За ноч прачытваліся, мусіць.
Ён адкрываў нам
Беларусі
Душу пяшчотную, як лён.

Язэпу Драздовічу

Дзяўчаткам
па руцэ гадаў,
Быў дзіваком ён і паэтам.
І нейкі час
у снах лятаў
На неадкрытыя планеты.

Страх

Маленечкі і шэры, можа ён
Разбухнуць,
разрасціся невымерна,
Азмрочыць розум,
акашмарыць сон...
"Звычайны страх" —
вось вам яго найменне.

Страсць

"О ненавідная,
прыйдзі і адпусці", —
Сказаў паэт,
бо перажыў нашэсце
Няволі той,
што блізкая да смерці
І самая шалёная ў жыцці.

Улада

Яна заўжды з законам не ў ладах,
Бо і сама жадае быць законам.
Заканчвае жыццё
публічным сконам,
А то і горай —
з куляй у грудзях.

Вясной

Адлюстравана неба
ў лужынах,
Вачам адкрыўся
бруд зімовы.
Варона каркае прастуджана,
А дрэвы мараць пра абновы.

* * *

Я ўсю зіму хадзіла па алеі,
Дзе цудам
захавалася гняздзечка.
Развеснілася — вочы падняла:
Вісіць на ліпе,
мокрае, пустое...

* * *

Горад, няўжо табе лісце няміла?
Зноў на бульварах
шчыруюць пілы.
Велікамучаніца таполя
Нема крычыць ад болю.

* * *

Сярод цюльпанаў і нарцысаў
Жыве вясна.
Яе капрызы
Вядомы ўсім, бо халады
Наробяць у садах бяды.

Але за ўменне акрыляць
Мы ўсё ёй можам дараваць.

Рызыка

Кожнага можа накрыць
Крыўда ці скруха.
Так, гэта рызыка — жыць,
З сіл выбівацца і плыць,
Рваць павуціну, як муха.

* * *

Чорнай хмары мяне не дагнаць,
Што напорыста сунецца,
грозна.
Накрывала не раз
невыносна,
Ды цяпер, выбачаюся, позна.
Хмара чорная, хопіць пужаць!

Сяргей ВЕРАЦІЛА



* * *

Я запомню гэты дзень,
Ты запомніш гэты дзень,
Мы запомнім гэты дзень:
Ты — крыніца,
Я — алень.

Я забыўся гэты дзень,
Ты забыла гэты дзень,
Мы забылі гэты дзень:
Дзе крыніца,
Дзе алень?

* * *

Учора было яму невыносна
тужліва,
І сёння лягчэй не стала.
Ён думаў пра тое, што сто
закаханых
Адзінакаханую не заменяць.

Яшчэ зусім нядаўна, так —
шчэ зусім нядаўна
Яго хвалявалі чужыя жанчыны.
А зараз яму здаецца, што
Нават іхнія імёны
Спарахнелі,
забытыя назаўсёды.

Ён, мусіць, хацеў бы заплакаць,
Калі б умеў, а ўмеў жа
калісьці,
Але развучыўся, і толькі вочы
Няўмелыя суха рыпелі.

І пад невыплаканаю тугою
У тры пагібелі сагнуўшы спіну,
Ён пайшоў,
і ягоныя крокі
Вялі яго далей ад кахання.

* * *

Стопы бетонных плітаў
траву тапталі.
Вечнасць ведала спосаб
палу ўтаймавання.
Вачэй тумановая стома
ўступала ў змову з маўчаннем.

На берагах засыналі хвалі,
На вяршынях спакоіліся аблокі,
У бур'янах хаваліся ўраганы,
І толькі сэрца трывожыў голас
далёкі.

Сніць пра полымя тлусты попел,
Помняць пра крылы
лёгкія косці,
Пяском у пустэльні прасыплецца
камень,
І толькі сэрца спагады папросіць.

Дрэвы хацелі ляцець і бегчы,
Дрэвы, абкружаныя асфальтам.
Я спаў і слухаў, як прачынаўся
мой голас
Ссіплым і ад пачаткаў заганным
альтам.

ВІНШУЕМ

З 70-гадовым юбілеем празаіка, крытыка, перакладчыка, педагога **Анатоля Клышку,** аўтара шматлікіх падручнікаў і кніжак для дзяцей, сярод якіх "У лясах Белавежы", "Самая лепшая хатка", "Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга", некалькі букваро́ў.

Празаіка **Віктара Казько** з 65-годдзем. Яму належаць вядомыя аповесці "Здравствуй и прощай", "Суд у Слабадзе", раманы "Неруш", "Хроніка дзетдомаўскага сада" і інш.

Літаратуразнаўцу **Уладзіміра Мархеля** з 65-годдзем, які выдаў кнігі "Лірнік вясковы: Сыракомля ў беларуска-польскім літаратурным узаемадзеянні", "Вяшчун славы і волі", "Крыніцы памяці", уклаў творы В.Каратынскага, Я.Лучыны і інш.

ЮБІЛЕЙНЫ КАЛЯНДАР

У красавіку споўнілася:

◊ 125 гадоў з дня нараджэння празаіка, драматурга і грамадскага дзеяча Язэпа Дылы;

◊ 115 гадоў з дня нараджэння беларускага празаіка, публіцыста, вучонага-эканаміста і грамадскага дзеяча Янкі Нёманскага;

◊ 100 гадоў з дня нараджэння крытыка, літаратуразнаўца, этнографа Сцяпана Баркоўскага;

◊ 95 гадоў з дня нараджэння паэта Алеся Прудніка;

◊ 85 гадоў з дня нараджэння празаіка Аляксея Карпюка;

◊ 85 гадоў з дня нараджэння празаіка Міколы Ракітнага;

◊ 75 гадоў з дня нараджэння крытыка і літаратуразнаўца Сяргея Гусака.

Пасля заканчэння вядомай акцыі "Літэкспрэс-2000" мы, яе ўдзельнікі, падпісалі дамовы, у якіх абавязваліся на працягу трох гадоў нідзе не друкаваць уражанні ад яе. Права на гэта мелі толькі арганізатары. З таго часу мінула не 3, а 5 гадоў, і я са спакойнай душой і з чыстым сумленнем прапаноўваю "ЛіМу" скарочаны варыянт сваіх нататак.

Аўтар.

Terra incognita[1]

Эсэ

Андрэй ФЕДАРЭНКА

/.../

У рамане У. Набокава «Дар» ёсць эпізод, як рэвалюцыянер-дысідэнт Чарнышэўскі ездзіў да рэвалюцыянера-эмігранта Герцэна ў госці ў Лондан. «Увогуле, гэты ваяж ахутаны такою смугою, піша Набокаў, і так мала слядоў пакінуў у творах Чарнышэўскага, што хочацца, насуперак факту, лічыць яго апокрыфам. Ён, які ўсё жыццё займаўся Англіяй, які жывіў душу Дзікенсам і розум «Таймсам», як ён павінен быў бы захлынуцца, як многа набраць уражанняў, як настойліва потым зварочваць на гэтае ўспаміны! Чарнышэўскі, аднак, аб паездцы ніколі пасля не гаварыў, а калі вельмі ўжо дакучалі, адказваў коратка: ды што там расказваць, — туман быў, гайдала, ну што яшчэ можа быць?»

Перачытваючы гэтыя радкі перад паездкай, я, помню, толькі пасмейваўся разам з аўтарам з незадачлівага «дес гроссэн русішэн гелертэн» (К. Маркс). Мне здавалася, у мяне ўсё будзе інакш, і што розныя дарожныя нататкі можна пісаць хоць зараз, нікуды не ездзячы. Падумаеш, вялікая мудрасць: «Парыж сустрэў векавым подыхам сваіх...»; потым можна будзе нешта падкарэкціраваць, напрыклад, памяняць Парыж на Мадрыд ці на Лісабон... А які плюс, што я за свае 36 гадоў ні разу не быў не толькі ў Еўропе, а ўвогуле ў заходнім накірунку далей Баранавічаў! Ды гэта ж tabule rase (калі ўжо лаціна)! Гэта ж чыстая плёнка, запраўленая ў фотаапарат, на якой хочаш не хочаш, а штосьці адаб'ецца (дарэчы, так крыўдна і шкада, што ўся «парыжская» плёнка, на якой, між іншым, магіла Мапасана, прапала! — па дурасці сам, уласнымі рукамі, ніколі не маючы справы з фотаапаратамі, засвяціў).

Карацей, думалася на пачатку дарогі, усё будзе цудоўна, памылак дысідэнтаў мінулага стагоддзя пастараемся не паўтарыць, і галаву напярод забіваць гэтым не варта.

Але забіць давялося. Упершыню — калі нам у Лісабоне раздалі жоўтыя такія буклецікі...

«1 кантынент+100 аўтараў+98 моў+46 дзён+700 рэйка-к/м+8 цягнікоў+праезд па 11 краінам+20 гарадоў+культурныя святы+выступленні+дыскусіі+заўсёды новая публіка+13 межаў+3 шырыні каляін+3 часавыя зоны+20 розных шырот = адзіная літаратурная з'ява еўрапейскага маштабу...»

Стоп, стоп! Тут не памылка? 100 аўтараў? Айнхундэрт творцаў? Якія едуць у адным цягніку, жывуць у адных і тых жа гатэлях, праязджаюць адны і тыя ж гарады і краіны, удзельнічаюць, як правіла, у аднолькавых мерапрыемствах? Творцы, якія проста вымушаны адно й тое ж бачыць і чуць і якія сотняю экспертаў тоўпяцца зараз за маёй спінаю (як і сам у гэты момант стаю за чыёйсьці) і цераз плячо зазіраюць у гэты ліст, чым робяць замах на адзіную маю пісьменніцкую прывілею — на САМасць. Бо што такое літаратура і ўвогуле творчасць па вялікім рахунку? Нішто іншае, як бунт супраць уніфікацыі, супраць калектыву, у тым ліку і супраць дысцыпліны як разнавіднасці сацыяльнага. Гэта эгаізм, даведзены да абсалюту, нават ніжэй за абсалют — гэта адмаўленне існуючай рэчаіснасці і жаданне прыдумаць рэчаіснасць сваю, і жыць у ёй, выдуманай, па сваіх законах — каралём; чужым сюды ўваход строга забаронены.

А ў нас, у 100 творцаў, што атрымліваецца? Дзе нашая САМасць (аснова творчасці)? Ну, напішуць 90 з нас, што будынкі ў Лісабоне прыгожыя. А ў Маскве, ці ў Берліне, што, непрыгожыя?

Людзі? У Мадрыдзе, і ў Варшаве, і ў Парыжы аднолькава растлумачаць і пакажуць, як куды прайсці, і прададуць тое, што вам трэба. «Бонжур, мадам, пардон — філіжанку кавы, калі ласка», — і дзяўчына-францужанка нават не падымае на мяне вачэй! У Германіі наогул як дома: «Э-э, містэр, энтшульдзігэн зі біттэ, во іст дзі хэрэнтуалэтэ?» (У мяне акрамя іншага чамусьці ў самых розных краінах ахвотна «стралялі» «Астру-люкс» — у Бруселі, напрыклад, я вымушаны быў падараваць гасцінічнаму насільшчыку цэлы пачак, так яму спадабалася гэтае вынаходніцтва Ціцянкова, і ён у падзяку абыходзіўся з маімі сумкамі, як з крышталёвымі.)

Кантакты і дыскусіі на літаратурных выступленнях? Будзем шчырымі — за рэдкім выключэннем ніхто не ведаў нас, і мы нікога не ведалі. Пераклады нашых твораў — паспешлівыя, падрадкоўныя — сенсацый не выклікалі. Выдаўцы не спяшаліся адзін перад адным заключаць кантракты на выданне нашых кніг. Спонсары не атакавалі нумары нашых гатэляў, прапаноўваючы свае паслугі. Кінапрадзюсеры не званілі па мабільніках, напрошваючыся на супрацоўніцтва з намі. Адсюль няхітрая выснова: у кожнай краіне найперш ведаюць і цэняць пісьменнікаў сваіх, іх хочуць чытаць і паводле іхніх твораў здымаць кінафільмы і ўвасабляць у спектаклях на тэатральнай сцэне. Дзіка было чуць, што, напрыклад, у Швецыі авансам маладому пісьменніку можа быць прызначана пажыццёвая пенсія. Калі ласка, пішы, пакуль малады, набірай сілы, магчыма, неўзабаве і праславіш сваю добрую радзіму, а не атрымаецца — нічога страшнага! У Францыі пісьменніку асобна могуць плаціць за «права першай публікацыі па-французску»; пасля, канечне, ён можа выдавацца на любой, якой пажадае, мове, але напачатку, калі ласка, няхай з тваім шэдэўрам азнаёмяцца суайчыннікі. І гэта правільна. Гэта проста здорава (скажам, падавіўшы ўздых)...

Не было, асабліва ў краінах Заходняй Еўропы, і ніякай публікі, акрамя саміх удзельнікаў экспрэса і журналістаў. Выступалі адзін перад адным. Партугалец чытаў вершы па-партугальску, а беларус з немцам слухалі, затым беларус чытаў па-беларуску, а слухалі ўжо немец з партугальцам... Нейкае падабенства ўласна творчых выступленняў — для публікі — пачалося з Калінінграда, але й тады «дыскусіі» адразу набылі палітычную тэндэнцыю, а таксама — без гэтага не абыходзілася нідзе — пачыналіся і заканчваліся пытаннем: «Чаму менавіты вы, а не іншыя пісьменнікі, патрапілі сюды — паводле якіх крытэрыяў праводзіўся адбор?»

Вось так стала зразумела, што напісацца могуць гэтыя нататкі — прынамсі, мною — толькі ў адным выпадку. Ніякага сюсюкання! Ніякага «Парыж сустрэў нас векавым подыхам"! Не Еўропа маімі вачыма — а што такое я ў Еўропе. І калі ўжо без «векавога подыху» ніяк, дык хай гэта будуць тыя ж «вечныя» разборкі ў самім сабе. Пад іншым небам, на фоне іншай архітэктуры, пад акампанемент іншых моў, сярод іншых народаў і культур...

Не так і шмат часу прайшло, каб усё патроху прымільгалася, прыелася, каб убачыць і зразумець, што, у прынцыпе, усё на ўсё падобна... А гэтая проста да расчаравання імгненнасць перасячэння межаў? Толькі што ж быў Мінск, начныя «цёплыя» провады, калі ірваўся ў дарогу ўжо ад таго толькі, абы хутчэй яны скончыліся... Ледзь прыплюснуў вочы ў самалёце — на табе, ужо Францыя, аэрапорт імя Дэ Голя. Ды на працу ў «Полымя» даўжэй едзеш! Чаму Францыя, адкуль узяўся Дэ Голь, калі яшчэ і гадзіннік не пераведзены і паказвае беларускі час, калі яшчэ мінскі чад з галавы не выветрыўся, а ў вушах стаіць звон чарак?.. Так і не разабраўшыся, што да чаго, у другім самалёце нарэшце прыдрамнуў — якое «прыдрамнуў», ужо будзяць, ужо знаёмы, чырвона-зялёны, родны партугальскі сцяг трапечацца на ветрыку. Добры дзень у хату! Лісабон. Край Еўропы. Будынкі лепяцца адзін да аднаго, як высечаныя ў скалах, пальмы, акіян Атлантычны, у якім назаўтра пакупаўся, а паслязаўтра ў хуткасным цягніку (у «імперыялістаў» іншых і не бывае, дарэчы) ужо імчаў уздоўж Пірынеяў у Іспанію, даючы інтэрв'ю на беларускай мове, якое шведка перакладала на мову англійскую, фінскаму тэлебачанню!

Праз тыдзень праблемы побыту зусім засланілі рамантыку. Будзённымі зрабіліся пераезды з горада ў горад і з краіны ў краіну. Усе мы на дзіва хутка і спрытна навучыліся пакаваць чамаданы, а адной з галоўных тэм стала гаданне: паднясуць іх у чарговым горадзе да гатэля, ці давядзецца валачы самім. Іншае пытанне — нашто было цягнуць столькі непатрэбшчыны? Паказальная тут гісторыя Петэра Саўтэра, пісьменніка эстонскага — аб тым, як ён з маладой жонкаю ездзіў у Англію (аналогія з Чарнышэўскім) на заробкі. І першае, што з імі здарылася, быў крадзёж. Прычым укралі ўсё, ад грошай, дакументаў і чамаданаў да ледзь не нацельнай бялізны. Праз паўтара гады маладая сям'я вярнулася ў Талін на аўтамабілі, за якім следам ехаў розным дабром набіты грузавік. «Вось гэта самыя лепшыя ўмовы праверыць, на што ты здатны — калі ў цябе толькі рукі і галава», — рэзюмаваў Піт. Канчаем тэму багажу.

А яшчэ праз тыдзень імклівая «перамена месц» пачала проста надакучаць. І ўжо не вырываліся воклічы кшталту таго (пасля гэта стане крылатым выразам), які выгукнуў рускі пісьменнік, уязджаючы ў начную, рэкламнымі агнямі залітую, казачна-прыгожую іспанскую сталіцу: «Э-эх, Мадрыд-тваю-мацъ!» — чым лішні раз пацвердзіў, без усялякай іроніі, вялікасць рускай літаратуры і багацце і ёмістасць рускай мовы, бо прадстаўніку якой яшчэ нацыі ўдасца ўмясціць у адзін воклічі столькі ўсяго? Тут і захапленне, і здзіў, і падзяка, і, магчыма, зайздрасць, што вось якая казачная прыгажосць існуе на свеце, вось якое ёсць жыццё, а мы і не падазравалі... Пазней гэты ж пісьменнік напіша ў альбоме — у адным з тых, якія самыя прадбачлівыя з нас насілі па цягніку, збіраючы туды розныя пажаданні і аўтографы (доўга я не мог узяць у толк, навошта, а цяпер разумею: хоць бы і гэтыя вось нататкі — разгортвай альбомчык, чытай, перапісвай...) — зрыфмуе ён так:

«Охреневал» в Мадриде я,
В Париже я «торчу»,
«Бухать» буду в Мальборке,
А в Минске... помолчу.

/.../

Словам, яшчэ тыдні праз два здзіўляцца перасталі зусім. З'явілася залежнасць паміж часам матэматычным, прасторавым — і індывідуальным, уласным. Можна было нарэшце спыніцца і агледзецца. Падумаць. Сёе-тое асэнсаваць. Сябе пашукаць у свеце... А гэтыя пошукі самасці, бывала, прыводзілі да надта цікавых знаходак. У горадзе Берліне ў 2 гадзіны ночы, паленаваўшыся ісці да гатэля пехатой, я спусціўся ў метро і выпадкова патрапіў не на звычайную, а на хуткасную лінію. Канечне ж, заблукаў. Апынуўся недзе аж на задворках Заходняга Берліна. А можа, Усходняга? Няма ў каго папытаць. Ноч. Машыны праносяцца па аўтабане з хуткасцю пад сто пяцьдзесят мінімум. І хоць бы дзе чалавечак! Справа ў тым, што берлінскае метро ўжо задужа дэмакратычнае. Няма там ніякіх, звыклых нам, будачак з жанчынамі ўсярэдзіне, няма нават турнікетаў, а проста стаяць пры выхадзе на платформу такія ледзь прыкметныя, метровага расточку, слупкі-кампосцеры. Калі ў цябе ёсць сумленне – кампасціруй талон, а няма – едзь так. Адзін толькі пагрозлівага выгляду негр, як прывязаны, цягаецца за мною... Пакуль не наблізіўся, і высветлілася, што ў яго больш празаічныя клопаты — той самы «во іст дзі хэрэнтуалэтэ?» Толькі недзе за тры гадзіны ночы самі падышлі да мяне два падлеткі:

«Вас іст лос?»

Мала таго, што адзін выдатна ведаў па-расійску, мала таго, што быў у курсе «Літэкспрэса» — ён пазнаў яшчэ і мяне, бачыў па тэлевізары сустрэчу нас на вакзале! І, правёўшы начным Берлінам да самых дзвярэй (дзякую за ўсё, Штэфан) нашага «Унтэр дэн Ліндэн», папрасіў аўтограф...

«Дзеля гэтага варта было заблудзіцца», – абсалютна справядліва заўважыла на другі дзень Вольга Міхайлаўна Іпатава.

Канечне ж, сама па сабе раскоша: проста імчацца ў цягніку, у акно пазіраючы, па Еўропе (падумалася, стоячы каля акна сваёй аднапакаёвай мінскай клеткі, пазіраючы на ўбогі, адзін і той жа з дня ў дзень, з году ў год пейзаж — на бясконцую, падобна, што вечную, будоўлю аўтастаянкі на месцы высечанага і бульдозерамі ўтрамбаванага ляска).

Так — падарунак лёсу, які, можа, раз у жыцці бывае: гэтае стракаценне домікаў за вокнамі, гэтыя партугальскія пальмы, іспанскія алівы, французскае мора, калініградскі бурштын, маскоўская кватэра Булгакава, варшаўскія слівы ў закінутым парку каля Віслы, якімі ласаваліся бамжы...

Згодзен — «эх, Мадрыд-тваю-мацъ», не спрачаюся — «убачыць Парыж і памерці», усё правільна — «я люблю твою Красную площадь»... І ўсё ж, усё ж! Чаму памяць так адмаўляецца ўзнаўляць тое, чаму могуць быць сведкі? А ўпартай авечкай сунецца пасвіцца толькі на сваю «тэрра інкогніта»... Дзе гэта было? Дакладна помню, што ў Францыі. Віла Франсуа Марыяка ў паўднёвым дэпартаменце? Ці, наадварот, віла Маргарэты Журсэнар у паўночным? Няважна: вілы падобныя, не такія, як хаткі Купалы з Коласам...

Быў тады вольны час. Віла стаяла на пагорку, і я пайшоў уніз па скошаным поплаве, нагінаючыся і адшчыпваючы з-пад ног маладзенькае шчаўе, да лесу. Спявалі птушкі, звінелі конікі, свяціла сонца... Аднак цікава было не столькі любавацца наваколлем, з беларускім яго параўноўваючы, як адначасова сачыць і за сваёй душою. За тым, як падымаецца з самага споду яе даўняя, савецкая каламуць. Менавіта каламуць, пералівістая сотнямі адценняў — мазут на вадзе; разам з тым можна было вызначыць і асноўныя яе колеры.

Апынуўшыся за мяжою, чалавек павінен штосьці ўчварыць. Выкінуць якісь форцель. Яшчэ прасцей — ён павінен там альбо застацца, альбо хоць бы пафантазіраваць на гэту тэму. Так я заўсёды думаў пра іншых, хто ехаў за мяжу, так недзе думаюць у гэты час і пра мяне. Тут марна шукаць логікі, калі яна і прысутнічае, дык нейкая вывернутая, ірацыянальная. Тая самая, паводле якой рынуліся мы ўсе купацца ў Атлантычны акіян — хто хацеў і хто не хацеў, і бултыхаліся, зубамі ляскаючы ад холаду, і фатаграфаваліся — бо як жа іначай? Як гэта на беразе Атлантыкі быць і ног не памачыць? Паводле тых незразумелых (для замежных пісьменнікаў, але не для нашых) сюрпрызаў, якія падносілі еўрапейскім гасцям у мінскім гатэлі «Беларусь»: напрыклад, узялі ні з таго ні з сяго і адключылі тэлефоны ў іхніх нумарах. Калі небаракі лавінаю хлынулі ўніз — скардзіцца, тэлефоны падключылі, але «абрэзалі» тэлевізары. Потым, хоць гэта і маленькая подласць, сарвалі з дзвярэй нумара цыдулку, што тут штаб «Літэкспрэса». Не «паложана!» Я ўпэўнены, што супрацоўнікі гатэля самі пакугвалі ад дурных сваіх дзеянняў, але рабілі іх — бо нельга інакш. Што ж гэта атрымаецца, калі ўсё будзе як след? У нашых гатэлях трэба, каб адчуваліся хоць якія нязручнасці. У нашыя крамы ідзеш, як на здабычу, гатовы да змагання, на прадаўшчыцу пазіраеш сурова, пажадана, каб і яна табе адплаціла тым жа: гаркнула, шпурлянула тавар на прылавак, а інакш і «здабыча» ў рот не палезе...

Ззаду пачуўся тупат. Краем поплава бег да мяне мужчына і з ім — вялізны ратвелер, якіх многа бывае ў Мінску на мітынгах. Мужчына ўсміхаўся мне яшчэ здалёк.

— Бонжур!

— Бонжур, месье, — і я адказаў.

І так лёгка, так добра зрабілася раптам на душы. Нібы апынуўся ў далёкім дзяцінстве, у роднай вёсцы, дзе таксама колісь кожны з кожным вітаўся. А можа, я тут, у Францыі, жыў у якімсьці ранейшым сваім жыцці? Вось за гэтымі зараснікамі крапівы, за гэтай зламанай агароджай павінна быць сцежка... Так і ёсць — вось яна. Шырокая, убітая. Выводзіць на паляну. Тры сажалкі, у якія ўбягаюць-цурчаць ручайкі. Глыбіня сама больш метр, вада празрыстая і рыбы плаваюць. Я гадоў дваццаць ужо не бачыў, каб вось так, паверсе, рыба плавала. Толькі ў маленстве, калі ўзбаламучвалі ваду і шчупакоў лавілі рукамі. Была падобная сажалачка і ў Мінску, каля нашага дома, вадзіліся там карасі, гняздзіліся дзікія качкі — гэта там, дзе робяць цяпер аўтастаянку, заліўшы бетонам і сажалку, і карасёў з качкамі. Нават не прыкра, а проста балюча стала. Ды што ж у нас усё так гадзенька, так не па-людску, так безнадзейна?! Цягнік праносіцца міма, а мы, прытрымліваючы галаўныя ўборы, раты разявіўшы, глядзім яму ўслед, як глядзелі ў Калінінградскай вобласці ўслед нашаму «Літэкспрэсу»...

А сцежка так заманліва вяла некуды! Так кудысь клікала! Пайсці па ёй — проста перабіраць нагамі, пакуль не занясуць яны далёка-далёка, і не чуваць стане ні галасоў, ні вуркатання аўтамабіляў на шашы... І дні праз два выйсці з лесу — у якоесь сяло, да жандарскага

(Заканчэнне на стар.15)

[1] Непазнаная, невядомая зямля

Арт-пацеркі

У Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі працягваецца Міжнародны фестываль "Мінская вясна-2005".
29 красавіка — блюзавыя кампазіцыі, песні, інструментальная музыка Г.Старыкава ў выкананні аўтара і сяброў "Star-клуба" (да 10-годдзя яго стварэння). 30-га — Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі пад кіраўніцтвам В.Дудкевіча. "Па старонках памяці" — творчая вечарына знанага артыста, тэатральнага дзеяча В.Анісенкі, якая адбудзецца 3 мая. 5 мая на галоўнай філарманічнай сцэне выступае Беларускі дзяржаўны ансамбль "Свята"(мастацкі кіраўнік А.Кашталапаў).
1 мая, на Вялікдзень і падчас "Мінскай вясны", Акадэмічная харавая капэла РБ імя Р.Шырмы пад кіраўніцтвам Л.Яфімавай дае кан-

цэрт у Вялікай зале сталічнай філармоніі, уваход на які — бясплатны. Пачатак а 18-й гадзіне.

60-годдзю Перамогі прысвячаецца беларуска-расійскі праект, які прадстаўляе два буйныя творы ў выкананні Акадэмічнага сімфанічнага аркестра РБ з дырыжорам М.Снітко, салістаў і чытальніка. Гэта вакальная сімфонія нашага маскоўскага госця У.Дашкевіча "Салдацкі рэквіем" і вакальна-сімфанічная паэма І.Лучанка "Вайна не патрэбна". Канцэрт адбудзецца на фестывалі "Мінская вясна" 4 мая ў Вялікай зале БДФ .

У Малой зале БДФ фестываль працягваюць выступленні беларускіх выканаўцаў. 29 красавіка Р.Саркісава (скрыпка), А.Афанасьеў (віяланчэль), Д.Парэчын (кларнет), А.Вашкевіч (фартэпіяна) ра-

зам з вядучай канцэрта музыказнаўцай І.Зубрыч прадстаўляюць творы Л. ван Бетховена, П.Сарасатэ, Ф.Ліста, Ф.Мендэльсона, Б.Марціну, Ё.Горавіца, Б.Бартака, А.П'яцолы. 4 сакавіка ў цыкле "Фартэпіянны дуэт прадстаўляе" — канцэрт другі: Н.Котава ды В.Баравікоў іграюць рускую музыку XX стагоддзя.

Зала камернай музыкі, што на Залатой Горцы, таксама запрашае на чарговыя канцэрты фестывалю. 2 мая Беларускі саюз кампазітараў арганізуе тут бясплатны канцэрт. Наступным днём, 3-га, выступае арганіст з Украіны М.Чычэрын.

С.ВЕТКА

Фота забяспечана аўтарам

Пазнаёмцеся з аўдыёгідам!

Паслугамі аўдыёгіда ўжо даўно карыстаюцца наведнікі буйных музеяў свету. Для Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі гэта пакуль навінка. І з'явілася яна тут у сярэдзіне красавіка, дзякуючы ініцыятыве маладога навуковага супрацоўніка навукова-асветніцкага аддзела мастацтвазнаўцы Юліі Мішаковай. Ёй як аўтару праекта нічога не давялося вынаходзіць — трэба было проста звярнуцца да сусветнай музейнай практыкі.

Што ўяўляе сабою аўдыёгід? Плэер з навушнікамі ды 90-хвіліннай касетай, на якой запісаны тэкст экскурсіі па залах нашай асноўнай экспазіцыі. Уяўляеце, як гэта зручна для індывідуальных наведнікаў, якія не жадаюць далучацца да групавой экскурсіі або не могуць замовіць экскурсію для сябе асабіста! Выбіраючы аўдыёгіда ў спадарожнікі па інтэлектуальна-эстэтычным шпацыры, глядач, аплаціўшы паслугу, пакідае касіру 40 тыс. рублёў закладной сумы (за тэхніку) або асабісты дакумент. І падарожжа па музеі пачынаецца. Тэкст, складзены таксама Ю.Мішаковай, разлічаны, вядома ж, не на спецыялістаў, а на звычайных экскурсантаў, спалучае ў сабе якасці папулярнага асветніцкага агляду з акцэнтамі на больш значных работах, мастакоўскіх імёнах, ажыўлены дасціпнымі згадкамі з нагоды пэўных эпізодаў творчасці, гісторыі мастацтва. (Зразумела, з дапамогаю перамоткі можна паўторна сёе-тое і пераслухаць). Гаворыць аўдыёгід прыемным голасам акцёра Анатоля Ката, па-руску. Але неўзабаве тэкст экскурсіі будзе перакладзены і агучаны па-беларуску, па-англійску, па-французску, па-нямецку і, мабыць, яшчэ на некалькіх мовах. Такіх касет — 10. А ў асабістае карыстанне набыць можна дыск — з больш складанымі, спецыялізаванымі тэкстамі і музычным аздабленнем.

Адначасова з нараджэннем аўдыёгіда ў Нацыянальным мастацкім музеі РБ з'явіўся (па ініцыятыве супрацоўніка аддзела захоўвання мастака Аляксандра Зіменкі ды, зноў жа, Ю. Мішаковай) адмысловы ўваходны білет. Так, цяпер гэта не безаблічная паперка-квіток, а мініяцюрны мастацкі твор, узор гэткай ужытковай графікі, які спалучаецца з карыснай інфармацыяй. Афармленне мусіць мяняцца штогод, і яго абнаўленню будзе папярэднічаць спецыяльны конкурс сярод маладых мастакоў.

А ці чулі вы пра "Святло ўначы"? Такі праект, згодна з сусветнай практыкай, наш Нацыянальны мастацкі рыхтуе для сваіх наведнікаў на 14 мая: уваход у музей будзе адкрыты для іх аж да першай гадзіны ночы! Музей жыве — сюрпрызы працягваюцца...

С.БЕРАСЦЕНЬ

Фота К.Дробава

«Ах, колькі ёсць красы...»

Чулы сэрцам заўважае прыгажосць паўсюль, нават у будзённым жыцці з яго клопатамі і турботамі, заўважае прыгажосць прыродную і створаную чалавекам. Нас вабяць прыродныя ландшафты, архітэктурныя гмахі і скульптурныя кампазіцыі, тое, што відаць здалёк, што кідаецца ў вочы. Але не меншую цікавасць уяўляюць мініяцюрныя творы мастацтва.

Чэліні статуй не рабіў,
А толькі статуэткі, —
Аднак артыста шчыры быў...

Гэтыя радкі з верша Максіма Багдановіча сталіся годным адказам крытыку на папрокі, што паэт піша невялікія па памеры творы. Бенвенута Чэліні, якога згадвае М. Багдановіч, знакаміты італьянскі скульптар і ювелір, у сваёй працы быў прыхільнікам малых, вытанчаных форм.

Ёсць у гэтых творцаў паслядоўнікі ва ўжо XXI стагоддзі. Сярод іх — Аркадзь Новік, "шкляных спраў майстра".

Нарадзіўся ён у сяле Вялікія Літвінавічы Гомельскай вобласці. Скончыў мастацкае вучылішча імя Мікалая Рэрыха і мастацка-тэхнічную акадэмію (факультэт мастацкай керамікі і шкла) ў Санкт-Пецярбургу. Жыве і працуе ў Барысаве. Яго творы знаходзяцца у шматлікіх музеях і прыватных калекцыях Беларусі, краін СНД, у ЗША, Кітаі. З яго творамі можна было азнаёміцца ў Мінску, у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, дзе прайшла мастацкая выстаўка "Кветкі і сэрца Радзіме". Аўтар прадставіў скульптуркі са шкла: фігуркі птушак, звяроў, кветкі. Усе мініяцюры, выкананыя ў адной тэхніцы, не падобныя адна да адной, кожная мае свае адметнасці, свой характар.

Найбольшае замілаванне ў супрацоўнікаў музея выклікалі кветкі і сярод іх найперш васілёк, які, вядома, быў для Максіма сімвалам Радзімы. І для нас гэтая кветка — сімвал Беларусі, найпрыгажэйшай краіны ў свеце, такой багатай на таленты.

Ірына МЫШКАВЕЦ,
вучоны сакратар Літаратурнага музея М. Багдановіча

Акардэон сабраў сяброў

Маленькая ўтульная зала Маладзёжнага тэатра эстрады была поўная. Тут сабраліся сябры акардэона і акардэоннай музыкі, каб спрычыніцца да своеасаблівага бенефіса Вікторыі Старыкавай, кіраўніцы калектываў — удзельнікаў канцэрта і настаўніцы студэнтаў, якія выступалі ў той вечар.

Праграму складалі эстрадныя апрацоўкі папулярных мелодый і песень, добра знаёмых шырокаму колу слухачоў. У першым аддзяленні гучаў выключна акардэон. Зусім нязвыкла, з элементамі жартоўнай эстраднай імправізацыі была прадстаўлена музыка В. А. Моцарта ў канцэртным ронда В. Новікава "Прабач мне, Моцарт", у выкананні студэнта 3 курса БДУ культуры і мастацтваў Сяргея Бурдзеева. Асабліва спадабаўся і запомніўся слухачам "Калаж на тэмы з оперы "Кармэн" выдатнага кампазітара Я. Дзярбенкі, дзе акрамя музыкі самой оперы аўтар выкарыстаў улюбёныя і добра вядомыя нам мелодыі. Гэты твор быў яскрава і эмацыянальна выкананы студэнткай 4 курса Святланай Пянткоўскай.

Па-новаму, цікава і незвычайна прагучала ў выкананні ансамбля "Капрычыо" руская народная песня "Утушка луговая" ў апрацоўцы Ц. Трафімава "Качачка ў Лацінскай Амерыцы". Гэты калектыў існуе пры БДУ культуры і мастацтваў зусім нядаўна. Але нягледзячы на сваю маладосць, ансамбль "Капрычыо" ўжо з'яўляецца лаўрэатам конкурсу выканаўцаў на народных інструментах у Санкт-Пецярбургу (2002 год) і паспеў нават здабыць сабе прызнанне і папулярнасць сярод аматараў эстраднай музыкі.

Вельмі яскрава і эфектна, надзвычай каларытна гучала балалайка ў не ўласцівым для яе стылі. У выкананні студэнткі 4 курса Лізаветы Грыгор'евай, у суправаджэнні ансамбля, слухачам была прадстаўлена цудоўная апрацоўка Я. Шыбаліна рускай народнай песні "Ах, ты, бяроза".

Ансамбль не абмінуў і такога папулярнага ў наш час кампазітара, як А. П'яцола: прагучалі яго "Fugata" і "Primavera Porteno".

Другое аддзяленне канцэрта пачалося з выступлення аркестравай групы народнага ансамбля народнага танца "Белая Русь", што пры Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. У новай, эстраднай, віртуознай аранжыроўцы слухачам была прадстаўлена даўно знаёмая "Хава-Нагіла" ў апрацоўцы І. Габрыэл.

Вялікім кантрастам прагучала выступленне трыо балалаек БДУКіМ пад кіраўніцтвам Тацяны Івановай. Лёгка і нязмушана музыканты выканалі рускую народную песню "Ах, вы сени, мои сени" ў апрацоўцы А. Цыганкова.

Завяршала канцэрт выступленне актэта "Новы горад" Беларускай акадэміі музыкі, вя-

домага не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі, лаўрэата шматлікіх конкурсаў і фестываляў. Акрамя віртуозна і бліскуча выкананых ансамблем інструментальных твораў (У. Сёмін, "Папуры на тэмы італьянскіх песень" і "Папуры на тэмы з рок-оперы "Ісус Хрыстос Суперзорка", П. Звераў, "П'еса ў стылі кантры"), слухачам запомнілася і спадабалася выступленне абаяльнай спявачкі Нэлі Душчынскай. У суправаджэнні ансамбля яна выканала песню Л. Захлеўнага "Мілавіца" і аргенцінскае танга "Першая сустрэча".

У тым канцэрце ўдзельнічала некалькі калектываў, якія належаць да розных музычных устаноў, але ў складзе кожнага з якіх ёсць акардэон. І нягледзячы на тое, што ў склад гэтых ансамбляў уваходзяць толькі народныя інструменты, яны на сённяшні дзень у поўнай меры здатныя выконваць эстрадную музыку. Я лічу, што слухачы з нецярплівасцю будуць чакаць новых сустрэч з імі!

Марына БУЖОР

Фота забяспечана аўтарам

Чароўны куфэрак

Пяты раз на Любаншчыне расчыніў сваё вечка "Чароўны куфэрак" — фестываль дзіцячай тэатральнай творчасці. У ім узялі ўдзел не толькі лепшыя аматарскія калектывы Мінскай вобласці, але і госці: узорны тэатр-студыя "Сюрпрыз" з Лепеля і тэатр "Сустрэчы" з Гатчыны (Расія).

Паўнюткая зала ў вёсцы Сарачы шчырымі воплескамі вітала і класіку, увасобленую на сцэне (паводле казак Р. Кіплінга і народаў свету, "Альпійскай балады" В. Быкава), і творы сучаснай беларускай драматургіі. Так, узорны тэатр "Летуценнікі"(кіраўнік Ала Каткавец) паказаў спектакль "Навошта мурашцы крылы" паводле п'есы З. Дудзюк, а навучэнцы Маладзечанскай беларускай гімназіі (узорны тэатр "Тэст" пад кіраўніцтвам Таццяны Бабей) — паводле п'есы Г. Каржанеўскай "Лясное брацтва".

Акрамя згаданых калектываў, на трэці, заключны дзень фестывалю каштоўнымі падарункамі і дыпломамі былі ўзнагароджаныя ўзорныя тэатры: "Маяк" г. Дзяржынска, "Усмешка" Уздзенскага ГДК, "Бі-Ба-Бо" са Слуцка, "Вясёлы балаганчык" з Мар'інай Горкі, "Ялінка" в. Нарач Вілейскага раёна. Адзначаны лепшыя выканаўцы галоўных і эпізадычных роляў, мастацкае і музычнае вырашэнне спектакляў, разнастайнасць тэатральных форм і адданасць традыцыям.

Журы, якое ўзначальвала заслужаная артыстка Беларусі прафесар Рыма Маленчанка, прыйшло да высновы, што арганізацыйны і мастацкі ўзровень тэатральнага свята Міншчыны з кожным годам павышаецца.

Вольга ПАЎЛЮЧЭНКА

Фота Ю.Плюшчава

На здымку: Р. Маленчанка ўручае ўзнагароды.

Народная артыстка Беларусі...

Мінула 40 дзён, як не стала унікальнай жанчыны, народнай артысткі Беларусі Зінаіды Іванаўны Браварскай...

Аднойчы, калі шукаў творчую тэму, прафесар Тамара Гаробчанка параіла: "А напішыце пра Браварскую!" Было гэта летам 1999 года. Я вельмі хваляваўся, калі патэлефанаваў да Зінаіды Іванаўны, бо ведаў, што артыстка асабіста была знаёмая з Янкам Купалам...

Я не перабольшу, калі скажу, што з Браварскай мы пасябравалі. У верасні 1999 года папулярная гарадская газета надрукавала маё інтэрв'ю з Зінаідай Браварскай. Паміж мною, супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры, і народнай артысткай была вялікая розніца ва ўзросце, каля 60 гадоў, але не было перашкод бываць дома ў знакамітасці, запісваць яе думкі. Часам я прыносіў Браварскай кнігі беларускіх пісьменнікаў, многіх з якіх яна ведала асабіста.

Неўзабаве выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпусціла мемуары Браварскай, якія яна напісала разам з журналістам Ірынай Кірылюк. Кніга пабачыла свет у сакавіку 2002 года, але ў продаж наклад 1 500 асобнікаў не трапіў наогул. У кнізе шаноўная Зінаіда Іванаўна расказала чытачу пра карыфеяў купалаўскага тэатра: Барыса Платонава, Глеба Глебава, Паўла Малчанава, Леаніда Рахленку, Лідзію Ржэцкую, Ірыну Ждановіч, дынастыю Уладамірскіх, Веру Пола, Раісу Кашэльнікаву, Галіну Макараву, Стэфанію Станюту... Яна разам з імі рэпеціравала, ездзіла на гастролі, іграла спектаклі, хадзіла да іх у госці — жыла адным з імі жыццём.

У кнізе Зінаіды Браварскай знойдзеш і ўспаміны Барыса Эрына, Валерыя Раеўскага, Галіны Уладамірскай, Барыса Герлавана, Івана Вашкевіча, Тамары Абакумоўскай.

Яшчэ здаецца нядаўна я віншаваў Зінаіду Іванаўну з Новым годам, але і не думаў, што хвароба так хутка падточыць жыццё артысткі, бо яна выглядала вельмі бадзёра і энергічна. Зінаіда Браварская была мудрым, мабільным чалавекам! Яна была аптымістам і вельмі любіла жыццё...

Браварская нарадзілася 31 жніўня 1916 года ў Адэсе, але многія лічылі яе беларускай.

Аляксей ШАЛАХОЎСКІ

На здымку: у спектаклі "Забыты ўсімі" паводле Н. Хікмета. 1958 г.

Фота забяспечана аўтарам

Такая розная «Купалінка»

Нездарма параўноўваюць беларускую песню з празрыстай рачулкай, што жвава бяжыць, пераліваецца, звініць, вабіць сваёй крынічнай свежасцю, пераменлівасцю. Гучыць — і, нібыта мінаючы вуха, трапляе адразу ў людское сэрца.

У сваім жаданні як мага шырэй, разнастайней падаць прыгажосць беларускай песні, яе асаблівыя праніклівыя інтанацыі, меладызм, чуллівую шчырасць артысты Дзяржаўнага фальклорнага гурта "Купалінка" дасягнулі сапраўдных вышынь выканальніцкага майстэрства.

Амаль 40 гадоў працуе плённа ў калектыве салістка і цяперашні мастацкі кіраўнік "Купалінкі" Алена Цялькова — заслужаная артыстка Беларусі. Апошнім часам пад яе кіраўніцтвам значна пашырылася мастацкая палітра гурта. Да чыстага тону акапэльнага гучання былой "Купалінкі" яна дадала інструментальную музыку, танцы, побытавыя замалёўкі. Праз фразы, характары, вобразы народных персанажаў наблізіла акадэмічнае выкананне беларускай песні да сучаснага слухача.

У рэпертуары ансамбля прываблівае багацце ды жанравая разнастайнасць канцэртных нумароў: ад стрыманых акадэмічных харалаў, кантаў — да музычна-драматычных, танцавальных замалёвак, як, напрыклад, "Вечарынка у вёсцы" ці "Паўлінка". Ёсць таксама побытавыя гутарковыя сцэнкі. Ёсць папулярная лірычная "Зорка Венера", аздобленая "жывымі" спевамі салаўя ды строкатам цыкад. Ёсць агністая "Дудалка", якая дазваляе бліснуць харэаграфічным талентам спевакоў ды музыкантаў. Наогул жа, універсальнасць выканаўцаў можна аднесці да найбольш значных дасягненняў "Купалінкі". Але ўсё ж такі галоўнай застаецца беларуская песня, прадстаўленая шырока ў праграмах, падрыхтаваных за мінулыя гады: "Подых вякоў", "Вяселле", "Песні палёў" ды інш. У залатую скарбонку трапілі песні: "Купалінка", "Вішанька", "Цячэ рэчанька"...

Класічнае шматгалоссе, набліжанае да аўтэнтычнага гучання, пошук новых фарбаў, адценняў, дынамічнасць выразных сродкаў, сінтэз розных відаў мастацтва, яскравая форма падачы — лепшыя рысы творчасці гэтага цудоўнага калектыву.

Ясь КАВАЛЕВІЧ

Фота аўтара

Аб'ява

Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі" аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5-ці гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую прапіску) з далейшым заключэннем кантракта ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны наймальнікам:

1. — кафедра драўляных духавых інструментаў
прафесар — 1

2. У змяненне часткі тэксту аб'явы ў газеце "Літаратура і мастацтва" № 15/4302 ад 15.04.2005:

ЗАМЕСТ:

— кафедра беларускай музыкі
прафесар — 1

ЧЫТАЦЬ:

— кафедра тэорыі музыкі
прафесар — 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання. Заявы і дакументы накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Даведкі па тэлефонах: 227 49 42; 226 06 70.

Шукальнік імя свайго:

Расійскі публіцыст XIX ст. М. Каткоў пісаў: "З канца 50-х гадоў дзіўная трывога апанавала нашу моладзь і выклікала ў яе выхадкі, якія ўражваюць сваёй эксцэнтрычнасцю і беспадстаўнасцю. <...> Некаторыя пакідалі Айчыну, якая клікала іх да карыснай дзейнасці, і за мяжою без дай прычыны з'яўляліся раптам эмігрантамі; некаторыя з іх пасля бясплодных вандраванняў і знясільваючай растраты моцы вярталіся на радзіму расчараванымі, разбітымі; астатнія знікалі без вестак". Зразумела, так званы нігілізм і пазнейшае народніцтва не ўзніклі ў выніку масавай "псіхічнай эпідэміі", але каткоўская характарыстыка ў многім стасуецца да біяграфіі нашага земляка Войслава Савіча-Заблоцкага, паэта, празаіка і публіцыста, які пісаў на некалькіх еўрапейскіх мовах. Ён увайшоў у гісторыю нашай літаратуры як паэт і аўтар рэдкіх у XIX стагоддзі эпісталярных твораў на беларускай мове.

Войслаў (Вайніслаў)-Казімір Суліма-Савіч-Заблоцкі нарадзіўся 15 сакавіка 1850 года ў маёнтку Панчаны Дзісенскага павета ў заможнай і радавітай шляхецкай сям'і, ён рана застаўся бязбацькавічам. Сямейная неўладкаванасць прывяла да таго, што дзіця, па сутнасці, гадавалася пад апекай дваровых. "Простая" ці "мужыцкая" мова, бадай, тады ўжо была засвоена падлеткам, які захаваў сімпатыі да "чарналюда" на ўсё жыццё.

Савіч-Заблоцкі атрымаў адпаведную для свайго паходжання адукацыю. Ён быў чалавекам авантурыстычным і прадпрымальным, ініцыятыўным і запальчывым, імпульсіўным і няўжыўчывым. Чаго варты адзін пералік гарадоў і краін, у якіх яму давялося пажыць-пабываць: Вільня, Пецярбург, Варшава, Львоў, Кракаў, Прага, Лейпцыг, Страсбург, Парыж, Брусель, Аўстра-Венгрыя, Германія, Швецыя, Егіпет...

Скасаванне прыгоннага права і паўстанне 1863—1864 гадоў Савіч-Заблоцкі сустрэў у Вільні, дзе вучыўся ў гімназіі. Аднак яго адносіны да вызваленчага руху не былі адназначнымі, бо ён прылічыў Кастуся Каліноўскага да катэгорыі паноў-"палітыкуноў", якім процівастаўляў "шчырых" краёвых будзіцеляў, што пісалі пабеларуску або вывучалі народную творчасць у перадпаўстанцкі перыяд, гаварыў пра недавер сялян-беларусаў да твораў нелегальнай публіцыстыкі, напісаных "па-мужыцку".

WARTA

tygodnik poświęcony nauce, rozrywce i wychowaniu.

Poznań, dnia 5. Kwietnia 1885.

Rok XII. Nr.

Jadwisi L. zapamiętuję.

Opowiadanie Isze

Orlolety i Podkoźwojen,

Połocka Szlachta.

(Szkoł kend Pana Szymon Starkowicz.)

1879, Sikrynia 19. Rabka

Па ўласным прызнанні, у 1868 годзе Савіч-Заблоцкі стаў старшынёй і ініцыятарам стварэння ў Пецярбургу суполкі "Крывіцкі вязок" (саюз, гурток), члены якой, нібыта выключна дзеці тытулаваных і высокапастаўленых асобаў, высакародна хацелі "хадзіць у народ", сабраўшы грошы, збіраліся друкаваць "беларускія букі" (кнігі) і прагнулі "ўшляхціць", г. зн. літаратурна апрацаваць, беларускую мову. Бадай, гэта быў першы беларускі народніцкі гурток, праграма якога вызначалася нацыянальна-асветніцкай скіраванасцю. Пакуль "крывіцкія гурткоўцы" вывучалі фальклор, збіралі матэрыялы для беларускага слоўніка, займаліся гісторыяй краю, на іх не звярталі ўвагі, але як толькі іх добрыя намеры пачалі перамяшчацца ў рэальную плоскасць, — рэпрэсіі. Вынікі Савіч-Заблоцкі апісаў так: "Мы, не зрабіўшы яшчэ нічога, папаліся ў надзор, польская эміграцыя <...> ўсіх нас у агенты маскоўскага ўрада запісала...".

Менавіта тут хаваецца адна з прычын жыццёвай драмы Савіч-Заблоцкага, якога выслалі пад нагляд паліцыі ў Варшаву, дзе ён надрукаваў на польскай мове паэму "Праўдападобная гісторыя" і нарыс пра жыццё Каперніка. Ён адчуў сваё літаратурнае прызванне і быў перакананы, што можа прынесці "карысць грамадству хутчэй у літаратуры, а не на іншым полі дзейнасці". У 1873 годзе, знаходзячыся ў Варшаве, малады чалавек робіць смелую спробу надрукаваць свае беларускія вершы. Ён разумеў неардынарнасць такога кроку, калі пісаў рэдактару вядомага пецярбургскага часопіса: "Нехта дасылае ў "Вестник Европы" навуковыя працы, <...> я — некалькі вершаў на беларускай мове... Гэта дзіўна, ці не так?" Тэксты трох дасланых у "Вестник Европы" вершаў Савіч-Заблоцкага — "З чужбіны", "У роднай зямлі", "Да перапёлкі" — упершыню былі апублікаваны толькі ў 1946 годзе ў часопісе "Беларусь". З пункту гледжання паэтычнай тэхнікі — гэта не шэдэўры, але яны з'яўляюцца найбольш раннімі па часе ўзорамі пейзажнай і медытатыўнай лірыкі ў беларускай паэзіі XIX стагоддзя. Савіч-Заблоцкі быў заложнікам гістарычных акалічнасцей: не будучы этнічным палякам, ён праз усведамленне сваёй беларускасці хацеў "наблізіцца" да рускіх. Малады чалавек разумеў, што ён не паляк, але адчуваў сябе лішнім і адрынутым у Беларусі, ды і ў Расіі.

Відаць, усведамляючы сваю непатрэбнасць, Савіч-Заблоцкі ўвосень 1875 года выехаў за мяжу. У 25-гадовым узросце максімаліст і летуценнік ідзе ў свет, каб 12 гадоў вандраваць па еўрапейскім кантыненце, зарабляючы на хлеб пераважна журналісцкай працай. Спачатку ён спыніўся ў Львове, дзе каля трох гадоў працаваў у газеце "Ruch Literacki". Затым апынуўся ў Тарнове, а ў 1879 годзе — у Кракаве. У канцы 70-х гадоў Савіч-Заблоцкі прадаў свой вотчынны маёнтак, але грошай хапіла ненадоўга, а сталага заработку не было. Матэрыяльныя цяжкасці ён не пераадолеў да канца жыцця, па якім у далейшым ішоў як праўдзівы пралетарый. У гэты час напоўніцу праявіліся авантурыстычныя схільнасці маладога чалавека. У красавіку 1879 года яго выдалілі за межы Аўстрыі за шарлатанства і махлярства. Тады ж ён цалкам страціў сувязі са сваякамі і пачаў вандраваць па гарадах Еўропы. Падарожны вецер і зменлівы лёс пілігрыма заносілі яго нават у краіны колішніх фараонаў і вікінгаў.

З перыяду туляцтва нам вядомы толькі асобныя разрозненыя факты, з якіх даволі цяжка скласці цэласную карціну. Але вельмі важна тое, што і на чужыне пісьменнік не забывае і не кідае роднага слова. 19 сакавіка 1882 года ў Парыжы ён беларускім і антырускім па пафасе вершам вітаў украінскага польскамоўнага паэта Багдана Залескага, тады ўжо 80-гадовага юбіляра. Твор быў падпісаны не без апломбу: "Вайніслаў Казімір Савіч-Заблоцькій з Беларусі (польскій шляхціц-пан, а ў Гудаў грахф), быўшый галава Крывіцькаго Вязку".

У 1885 годзе познанская газета "Варта" друкуе аповесць В. Савіча-Заблоцкага, якая, пачынаючы з першага ўрыўка, змешчанага ў 562 нумары згаданай газеты за 5 красавіка, падаецца адразу пад некалькімі загалоўкамі ("Арлалёты і Падканвойны", "Полацкая шляхта", "Жаніцьба Ягамосьці пана Шатана Старшага") і з некалькімі эпіграфамі. Сам аўтар у адным са сваіх лістоў назваў гэты свой твор „Полацкая шляхта пана Паўла Завішы" і тут жа своеасабліва акрэсліў яго жанравую прыналежнасць: "прадоўгая гутарка з жыцця-быцця Белай Русі ў 1800 і др. року". Павел Завіша, аўтар-персанаж, які з'яўляецца толькі ў эпілогу аповесці, распавядае авантурную гісторыю кахання і жаніцьбы пана Януша Паўла Арлалёта з паннай Зоф'яй з роду Падканвойных. Дзеянне разгортваецца на самым пачатку XIX стагоддзя, праз некалькі год пасля паўстання Касцюшкі, а таму як аўтарскія адступленні, так і рэплікі дзеючых асоб скрозь прасякнуты пафасам барацьбы за вызваленне, агністым патрыятычным пачуццём. На працягу ўсёй аповесці праяўляецца і "патаемная схільнасць" пісьменніка: яго імкненне да гісторыка-мовазнаўчых росшукаў. Моўны дыяпазон аўтара ўражвае: гэта не толькі лацінская, нямецкая, французская, англійская, літоўская, украінская, расійская, шведская і нават арабская мова, але таксама ідыш і, безумоўна, беларуская мова, што прысутнічае як на ўзроўні асобных слоў і выслоўяў, так і на ўзроўні цэлых тэкстаў, пераважна фальклорнага характару.

Частае ўключэнне беларускіх выразаў, асобных слоў і цэлых тэкстаў абумоўлена аўтарскай устаноўкай, звязанай наогул з ідэалогіяй народніцтва. Беларускія арыстакраты, якія размаўляюць па-польску, з глыбокай павагай ставяцца да беларускай мовы. Шляхта, якая жыве патрэбамі і турботамі свайго народа, — ідэал для аўтара "Полацкай шляхты".

Не ўсе сучаснікі В. Савіч-Заблоцкага, нават з ліку аднадумцаў, падзялялі яго патрыятычныя погляды. Сам пісьменнік скардзіўся, што пэўная частка польскіх эмігрантаў лічыла яго "маскоўскім шпегам" і здрадцам, сцвярджаючы, "што Русі ніякой нет, не бывала"... Ці не па гэтай прычыне, зважаючы на ў многім падобны гістарычны лёс беларусаў і ўкраінцаў, наш герой так "гарнуўся" ў эміграцыі да дзеячаў украінскай культуры і вызваленчага руху.

У Парыжы ў 1886 годзе Савіч-Заблоцкі наладжвае сувязь з украінскім эмігрантам, пісьменнікам і публіцыстам Міхалам Драгаманавым, якому па-беларуску напісаў некалькі лістоў. Тэксты чатырох з іх упершыню апублікаваны ў 1988 годзе. Яны каларытныя па мове і багатыя паводле зместу. У іх знайшлі адлюстраванне як палітычныя погляды аўтара, так і цікавыя факты яго біяграфіі. У адным з пісем ён, нібы спавядаючыся, з сумам канстатаваў: "Злыя людзі і польскія дурні брахалі на мяне; тай, меўшы па горла парадкаў нашых, хворы, выехаў я за граніцу ўжо сапраўды лячыцца і ніколі ўжо не вярнуцца, як аказалася. Цяпер, пан з панаў, ні кала ні двара, ні псячай нават будкі не маю". Падпісваючы свае лісты, карэспандэнт, здаралася, дадаваў да прозвішча тытул "граф" і самахарактарыстыку — "самашчыры беларусін".

У апошнім па часе вядомым парыжскім лісце 19 лістапада 1886 года Савіч-Заблоцкі пісаў: "Здароўе маё дужа нядужнае цяпер. Работы пропасць, чорнаработы! Букарня наша новых ужо мае цяпер гаспадароў< ...> тай такіх дурняў, што хвост ім прышыць тай у лес пусціць: былі б там свае!". Слабае здароўе, цяжкая праца, змена адносінаў французскіх уладаў да эмігрантаў — вось, бадай, тыя акалічнасці, што прымусілі Савіч-Заблоцкага думаць пра вяртанне ў Расію.

Новы 1888 год ён сустрэў ужо на Бацькаўшчыне. Але веды і здольнасці інтэлектуала-пралетарыя былі непатрэбныя ў віцебскай глухмені ды і сам наш схільны да прыгодаў герой не мог прывыкнуць да атмасферы правінцыйнай будзёншчыны. Ён едзе ў сталіцу краю, дзе з 1 кастрычніка 1888 года па верасень 1889 працаваў у рэдакцыі газеты "Виленский вестник". Цікава, што якраз тады ў гэтай кансерватыўнай газеце (1889, № 70) быў упершыню апублікаваны беларускі верш "Панскае ігрышча". Але і тут наш герой не супакойваецца — канфліктуе з землякамі, кідаецца ў крайнасці... З верасня 1889 года па май 1891 ён жыў у цётчыным маёнтку Губіна ў Лепельскім павеце Віцебскай губерні, адносна недалёка ад якога знаходзілася Вухвішча, дзе служыў аканомам Фелікс Тапчэўскі, найбольш верагодны аўтар верша "Панскае ігрышча". Затым Мінск, адкуль пісьменнік напісаў ліст у канцылярыю віленскага генерал-губернатара, у якім апавядаў пра свае намеры ехаць у Пецярбург. Яму выдалі пашпарт на пражыванне ў расійскай сталіцы, куды пісьменнік прыехаў у лістападзе 1891 года. Пасля 1893 года яго лёс увогуле невядомы. Не выключана магчымасць, што яго, надзвычай амбіцыйнага і нястрыманага чалавека, які не меў ні сям'і, ні сяброў, ні грошай, ні працы, проста паглынулі "пецярбургскія трушчобы", у якіх гінулі бясследна сотні і тысячы шукальнікаў прыгодаў.

І свае творы на польскай мове (паэму «Аповесць пра мае часы» (1876) пра пярэдадзень паўстання 1863—1864 гадоў на Беларусі, гістарычную аповесць «Полацкая шляхта» (1885)) ён прысвячаў беларускім рэаліям. З-за беларускага патрыятызму, незразумелага для палякаў і рускіх, да яго пераважна варожа ставіліся як адны, так і другія. Гэты вялікі ідэаліст-пакутнік часта не знаходзіў паразумення і з землякамі. Тым не менш, як чалавек бясспрэчна неардынарны, які валодаў некалькімі еўрапейскімі мовамі і шмат пісаў на іх, а ў перыяд культурнай стагнацыі прыкладаў намаганні для развіцця беларускай літаратуры, Войслаў Савіч-Заблоцкі варты не толькі нашай увагі, але і пашаны.

Ігар ЗАПРУДСКІ,
Жана НЕКРАШЭВІЧ-КАРОТКАЯ

На здымку: пачатак аповесці "Полацкая шляхта" ў газеце "Warta", 1885г.

Здымак забяспечаны Ж.Некрашевіч-Кароткай

Анатоль ЗЭКАЎ

Лапушыста і шырока
У грудзях адчай расце.
Прынясі хоць ты,
сарока,
Мне натхненне на хвасце.

Уладзімір СКАРЫНКІН

Я сягоння не ў гуморы,
Бо праблема ёсць з праблем:
Без натхнення дзень каторы
Я хаджу, сяджу і ем.
Без натхнення —
ў прыбіральні,
Як і ў ложку — без яго.
Знік імпэт былы дазвання,
У грудзях патух агонь.
З кута ў кут сную па хаце:
Дзе натхненне тое, дзе?
І каго ў тым вінаваціць,
Што ка мне яно не йдзе?
Быццам знікла ў полі чыстым,
Не злавіць —
як ні круці.
Ці то сам я,
лапушысты,
Праваронiў яго,
ці
Не шырока жыў
і вельмі
Не глыбінна ўрэшт пацеў?..
І цяпер маё натхненне
У сарокі на хвасце.



Калі ажыла душа...

Ты мне ў душу жыццё ўдыхнула,
калі пакінула мяне...

Алесь КАСКО

Калі я поруч быў з табою,
то і на свеце як не жыў:
душу пакінула жывое,
і амярцвела ўсё ў душы.
Перыяд той, не лепшы самы,
цяпер я згадваю, бы ў сне.
Мая душа і ажыла мо,
як ты пакінула мяне.
Не падсумуеш тут агулам,
ды часам думка ўсё ж дзяўбе:
ці ты жыццё ў душу ўдыхнула,
ці я ўраз выдыхнуў цябе?

Слых на ліфт

Я ператварылася ў слых.
Я слухаю ўздыхі дома.
Вось ліфт на дзевятым сціх.
І гэта не ты, вядома.

Вольга РУСІЛКА

Я дома, а слых мой там дзесь
Наструнены надта напята:
Куды гэты ліфт наш ідзе —
На пяты паверх ці дзесяты?

Нібы паравоз, ліфт гудзе,
Снуе, як чаўнок, па паверхах.
Спыняецца хай ён хоць дзе,
Абы толькі міма праехаў.

Бо спыніцца ліфт — і тады
Адно й застаецца жахацца:
Крый Божа,
калі гэта ты
Вярнуўся з работы знянацку.

Я знаю твой нораў круты —
На слова чытач хай паверыць,
Што будзе,
калі раптам ты
Заспееш каханка ў кватэры.

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

Моцны сон

Пад ранак вярнуўся з работы
І лёг адпачыць. Ды скрозь сон
І лёгкую стому дрымоты
Пачуў я: акно на балкон
Штурхнуў нехта весела, смела.
Зірнуў у пакой да мяне...

Васіль ДЭБІШ

Пад ранак вярнуўся з работы
І лёг адпачыць. Ды скрозь сон
Пачуў: завіталі наркоты
Ка мне праз суседні балкон.

Штурхнулі мяне надта смела,
Зірнулі на кухню. І там
Умялі мой "Люкс" ашалела
І ліверкі аж кілаграм.

Узяць бы падняцца з канапы —
І падлам раструшчыць насы...
Ды сон размарыў —
от пракляты!
Не даў зберагчы... каўбасы...



Мікола ТОНКІ

Пра ЛеГала

Служыў Паэзіі старанна.
Цяпер — ёй рэвізор які!
Назваць Бялінскім мо і рана,
Ды графаманам мне бакі.
Дасць Бог, ад прачуханкі гэтай
Пачнуць лаўчэй пісаць паэты.

Хайкерам

Навошта рыфмам біць паклоны
Ці ткаць з метафараў узор?
Пачуў:
закаркалі вароны —
Сядай, пішы японскі твор.
Крый Бог,
вароны анямелі б
То й тэм для хоку вы не мелі б.

Марына ГАРЭЛАВА

Гэта не значыць...

*** Калі вы блазан, гэта не значыць, што ваша месца ля трона.**

*** Калі вы ўсміхаецеся Фартуне, гэта не значыць, што яна адкажа вам тым жа.**

***Калі вы цікавіцеся жыццём палітыкаў, гэта не значыць, што іх цікавіць ваша жыццё.**

***Калі вы голы, гэта не значыць, што вы кароль.**

***Калі ты "зорка", гэта не значыць, што ты на "сёмым небе" ад шчасця.**

Уладзімір ЕРМАЛАЕЎ

Вясковы нацюрморт

Да цешчы ў госці завітаў зяцёк.
Накрыты стол абрусам беларускім.
Пад ручніком стаіўся кумпячок,
Ляжаць гуркі — найпершая закуска.

Нос дражніць самапханка — каўбаса.
Бліноў пухнатых на стале пагорак.
А ў пляшцы, як чысцюткая раса,
Гарэлачка зашкальвае за сорак.

І бульбачка... І скваркі верашчаць.
Яешня згатавана адмыслова...
Калі ўсё гэта зяць гатоў умяць,
Чаму ж ён, блін!
не любіць роднай мовы?!

Непаразумеліся

Любая хадзіла па пакоі...
І было ва ўсім нас свеце двое,
І нікога акрамя. Ані.

Любая разгублена хадзіла...

Ля акна разгублена стаю.

О, як вабяць і вусны, і клубы яе...

Я вазьму перачытваць Катула,
Хоць яго, прызнацца, не чытаў.

Што Катул, Петрарка і Лаура!..

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

Любая хадзіла без настрою
І сказала ўрэшце: "Загляні!"
Я прыйшоў.
Было ўсяго нас двое,
І нікога акрамя. Ані.

Ды азваўся раптам трэці лішні:
Не паспеў прысесці я на стул,
Як да нас уніз з паліцы кніжнай
Стаў спускацца рымлянін Катул.

Ў галаве маёй паэтам цесна,
Шмат я розных аўтараў гартаў.
А Катул прыстаў:
"Прызнайся чэсна,
Ты чытаў мяне ці не чытаў?"

Не гуляка я і не распуснік.
На маю бяду я кніжнік быў.
Вабілі клубы твае і вусны,
А з Катулам сеў —
пра ўсё забыў.

Я ў той вечар Гесіода-грэка
І Пятрарку пагартаў бы зноў,
Ды пачуў: "Тут што?
Бібліятэка?
Не пайшоў бы ты,
Навум, дамоў!"

Любая,
навошта гэтак груба?
Ты — паслала, я —
гатоў пайсці.
Толькі знай:
такога кнігалюба
Анідзе табе ўжо не знайсці!

Кузьма ТОЙ-ЯШЧЭ

Адкрыты ліст каханаму

Вечнасць спіць
Спіць віна
Спіць яна...
Гэтыя пышныя ягадзіцы
І грудзі яе — калыхаюцца...

Мікола ПАПЕКА

Здзівіў мяне ты, любы:
Не вочы сніш, не губы,
Не рукі мае ўвішныя,
А–ягадзіцы пышныя.

Цяпер,
Стаю ці сяду, —
Смяюцца людзі ззаду.

Малюнкі Алега КАРПОВІЧА

Міхаіл УЛАСЕНКА

Дробязі жыцця

* * *

Тузалі шэфа аднаго —
І па заслугах, недарэку,
Бо на падвор'і ў яго
Ні бэ, ні мэ, ні кукарэку.

* * *

А як узбрыкалася чэлядзь!
Адны таўкуць, другія мелюць,
І слёзы льюць, і мякка сцелюць,
І ўсе ў напалеоны цэляць.

* * *

Ёсць дом — утульная хаціна,
Стол у кутку,
дзе можна сесці,
Ды вось замучыла ангіна —
Ні табе выпіць,
ні паесці!..

* * *

Ад валасоў да барады
Хвалі яго на ўсе лады;
А валасы і барада —
Мо толькі птушкам
Для гнязда.

Мікола ВЯРШЫНІН

Эпіграмы

Дваякі падыход

Паэт прыйшоў.
Рэдактар без затрымкі
Яго схапіў у моцныя абдымкі:
— Твой рукапіс наверсе,
бач, ляжыць,
І можаш ты спакойна, браце, жыць.
Паэт пайшоў.
Той кажа: — Каб ты скіс!
І рукапіс перакладае ўніз.

Замкнёнае кола

Ён прыслаў аднойчы вершы,
І такі быў водгук першы:
"Пішаш проста, толькі штосьці
Не хапае прыгажосці".

А пасля перапрацоўкі
Быў адказ адмоўны зноўку:
— Так, прыгожа пішаш ты,
Толькі...
мала прастаты".

...А тытунь —паасобку

Паэт развёўся з паэтэсай
Пасля ідыліі сумеснай:
— Жыццё такое хай міне!
Хоць жонкаю была нядрэннай,
Ды падсякала мне карэнне,
Бо... крала вобразы ў мяне.

Прынцып творчасці

Пішы, як маўчаць немагчыма,
І правіла цвёрда трымайся:
Паэзія —
нібы жанчына:
Не любіш, дык не займайся.

Жывое слова Уладзіміра Юрэвіча

Ціха адышоў у вечнасць пісьменнік Уладзімір Міхайлавіч Юрэвіч. На пахаванне прынеслі кветкі лічаныя пісьменнікі, завіталі прадстаўнікі радыё, музея Янкі Купалы, радня і суседзі. А ўсё магло і павінна было быць зусім па-іншаму. Уладзімір Юрэвіч заслугоўваў дзяржаўнага развітання, усенароднага смутку.

Пісьменнік вырас у настаўніцкай сям'і. Яго дзед Мікалай Фёдаравіч таксама настаўнічаў, ведаў замежныя мовы. Адну зіму вучыў нават Янку Купалу. Інтэлігентнае асяроддзе і было тым жыццёвым падмуркам, на якім вырас вядомы празаік, крытык, перакладчык, заслужаны работнік культуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Уладзімір Міхайлавіч Юрэвіч.

У свае 16 гадоў ён прайшоў па конкурсе ў дыктары Беларускага радыё. Ішоў 1932 год. Юнак з захапленнем вывучаў родную мову, літаратуру, мастацтва, гісторыю. Яго голас ведала ўся Беларусь...

У спадчыне Уладзіміра Юрэвіча шмат кніг: "Слова і вобраз", "Шматгалоссе жыцця", "Погляд", "Абрысы", для дзяцей — "Тараскавы турботы", "Дзе начуе сонца", "Дожджык на колах", "Нястрашны страх". Пісьменніка Юрэвіча, здаецца, ведаюць усе радыёслухачы Беларусі, ад малога да вялікага, па яго перадачах "Жывое слова", якія ён вёў больш за 35 гадоў. Відаць, не было такога раёна, горада ці вёскі, адкуль бы не пісалі Уладзіміру Юрэвічу, не задавалі яму пытанняў, як патлумачыць тое ці іншае словаўтварэнне, тую ці іншую тапанімічную назву. На самыя складаныя запытанні пісьменнік знаходзіў пераканаўчыя, ясныя доказы.

На маім пісьмовым стале другі год ляжыць унікальная кніга з аўтографам Уладзіміра Юрэвіча — "Слова жывое, роднае, гаваркое..." Яна стала мне добрай настаўніцай пры напісанні ўласнай кнігі "Мы" — аповесці пра нашы прозвішчы. І я яшчэ раз пераканаўся, як Уладзімір Міхайлавіч ведаў і любіў сваю мову, як апантана ён рупіўся пра тое, каб яна заставалася жывой і запатрабаванай. Цяпер як чароўны абярэг гучаць яго словы: "Кожны чалавек на падыходзе да сваёй грамадзянскай сталасці павінен перакананым быць, што без мовы гіне перш за ўсё набытае праз стагоддзе духоўнае багацце народа — яго мова, традыцыі, гісторыя, мастацкая літаратура, парушаецца высокая працоўная мараль, слабеюць абавязкі перад культурай нацыі".

Давайце помніць, людзі, што са стратай аднаго чалавека, мы робімся бяднейшымі, давайце не забываць, што гэта і па нас пачынаюць галасіць званы. Давайце любіць адзін аднаго пры жыцці і помніць, шанаваць кожнага, хто пакінуў нас і адышоў у вечнасць.

Жывое слова Уладзіміра Юрэвіча не можа памерці, загінуць, забыцца. Яго творчай спадчынай павінны плённа карыстацца нашчадкі.

Уладзімір ЛІПСКІ

На здымку: У. Юрэвіч і А. Пісьмянкоў

Жывога слова чарадзей

памяці Уладзіміра Юрэвіча

Жывога слова чарадзей,
Ашчадна,
адмыслова,
Спяшаў данесці да людзей
Крынічнай сілы слова.

Яно свяцілася наскрозь
Хвілінаю любою,
На дзіва чыстае ад рос,
Сагрэтае любоўю...

Скаваў мароз
крынічны спеў,
Самотная Дуброва.

Але данесці ён паспеў
Да нас —
жывое Слова.

Уладзімір МАЗГО

Прынцыповы і шчыры

Адышоў... Беззваротна. Пакінуў свет белы.

І то, хвала Богу, прайшоў доўгім шляхам ад нараджэння 22 ліпеня 1916, калі, набрыняўшы крывёю, віравала і пачынала ламацца жыццё, да 18 лютага 2005, калі неаднойчы паламанае, па-новаму складзенае і зноў здратаванае нацыянальнае жыццё, якому ён аддана служыў, не падавала прыкмет на хуткае адраджэнне, чаго ён безумоўна чакаў, — не дачакаўся, у чым яго несумненная драма і трагедыя.

Уладзімір Міхайлавіч Юрэвіч перад вайной скончыў архітэктурна-будаўнічы інстытут, але па набытай прафесіі працаваць яму не давялося. Меў гонар быць адным з першых дыктараў Беларускага радыё і падчас вайны з Масквы "вяшчаў" на Беларусь. Цягам многіх гадоў ён клапатліва і нястомна вёў радыёклуб "Жывое слова", выдаў кнігу "Слова жывое, роднае, гаваркое" (1992). Памятаюць яго літаратары, і не толькі, як карэспандэнта маскоўскай «Литературной газеты» па Беларусі і як супрацоўніка часопіса "Маладосць", дзе ён быў за адказнага сакратара. Памятаюць як прыязнага крытыка і дарадцу. Ён працаваў і кіраўніком музея Янкі Купалы, нямала зрабіў дзеля адкрыцця музея-сядзібы Купалы ў Вязынцы і адпаведна ж уганараваны — Заслужаны дзеяч культуры Беларусі!

Асобна варта адзначыць гады служэння Уладзіміра Міхайлавіча Юрэвіча Саюзу пісьменнікаў Беларусі, дзе ён займаў пасаду літаратурнага кансультанта і быў годным паплечнікам кіраўнікоў М.Танка, І.Мележа, І.Шамякіна, Н.Гілевіча, І.Чыгрынава...

Юрэвіч у ліку іншых клопатаў у пісьменніцкай арганізацыі апекаваўся літаратурнай секцыяй нарыса і публіцыстыкі, куды ў сямідзесятыя-васьмідзесятыя гады ўваходзілі такія самавітыя постаці як Ігнат Дуброўскі, Іван Новікаў, Яраслаў Пархута, Валянцін Мыслівец, Анатоль Казловіч, Леанід Левановіч, Алесь Петрашкевіч, Леў Караічаў, крытык Антаніна Лысенка; у адначассе свяцілі сваім мастацка-публіцыстычным талентам Вера Палтаран, Янка Сіпакоў...

Невыпадкова таму ў яго кнізе "Абрысы" (1976), што ўяўляе "выбранае з літаратурнай крытыкі", як не большая частка артыкулаў прысвечана разгляду публіцыстычнай творчасці названых вышэй ды іншых аўтараў. Крытык зазвычай імкнуўся падвесці тэарэтычны грунт пад свае разважанні і карыстацца напрацоўкамі літаратуразнаўства, параўноўваў здабыткі беларускіх аўтараў з дасягнутым у жанры нарыса ў літаратурах іншых народаў, і гэта цікава.

"Калі ж публіцыстыка становіцца мастацтвам? – пытаўся ён і шукаў адказу: — Што ж тады прыпадае на нарыс?

Нарыс, сцвярджаў ён, павінен даць жывое, яркае, вобразнае ўяўленне аб падзеях і людзях (выдзелена ім)... Беручыся за аналіз пэўнага нарыса, важна высветліць, у якім выглядзе факт увайшоў у змест нарыса, ці стаў ён прадметам мастацкага даследавання і як гэта даследаванне зроблена!".

Багата што з аналітычнага досведу Уладзіміра Юрэвіча застаецца цікавым і надзённым, павучальным, асабліва для маладых літаратараў.

Пры ягонай датклівай увазе, садзеянні і падтрымцы пісьменніцкая публіцыстыка ў 1970-80-я гады дасягнула добрага плёну. Таму невыпадкова ў 1977 годзе была выдадзена анталогія "Беларускі савецкі нарыс" у 2-х тамах і штогод выдаваўся альманах "Сучаснік". Былі і іншыя выданні...

Я не стаўлю за мэту пералічыць тут усе крокі, заняткі, пасады, інтарэсы Уладзіміра Міхайлавіча. Адзначу адно: ён ніколі не займаў высокіх пасад, ключавых, як кажуць, становішчаў, але скрозь у галіне нацыянальнай культуры і літаратуры быў жаданым, патрэбным, карысным, пасвойму нават незамянімым. А таго, што ён зрабіў за свой век, хапіла б не на адно жыццё.

Спакойны, ураўнаважаны, разважлівы, прынцыповы і шчыры, трохі нават запаволены ў праяўленні пачуццяў, ён быў спадчынным інтэлігентам з адпаведным узроўнем эрудыцыі, чыннасці, дый лагоды высакароднай душы.

Праводзілі Уладзіміра Міхайлавіча ў апошні шлях з ягонай дамоўкі, што на вуліцы Пуліхава, пісьменнікі, знаёмыя, блізкія, дзеці і ўнукі, да якіх ён таксама ставіўся з вялікім тактам, любоўю.

Каля труны, перад спускам яе ў магілу, раптам запырхалі ў паветры, заскакалі па аснежаных галінках дрэў і зацвінькалі сінічкі. Багата іх... І падобна было, што гэтыя жывыя істоты таксама развітваюцца з добрым чалавекам.

Дзецям, сыну Леаніду і дачцэ Галіне, тады прыгадалася, як яны і ўжо іхнія дзеці прыкармлівалі сінічак за акном пад наглядам дзеда, якога цяпер хавалі. Ці не тыя самыя сінічкі былі? — гадалі яны...

Дык няхай лёгкай будзе зямля для цябе, дарагі чалавеча!

І няхай беларуская зямля назаўжды будзе беларускай! Бо інакш дзеля чаго ты жыў?

Васіль ЯКАВЕНКА

На здымку: У. Юрэвіч, Р. Булацкі і І. Пташнікаў

«Залатыя» сябры

Так адбылося, што ў маё жыццё Барыс Аляксеевіч Крэпак увайшоў неспадзявана. Як тое сталася, было надрукавана ў "ЛіМе" 5 мая 2000 г. ("Шэсцьдзесят — гэта многа ці мала?").

Імя гэтага чалавека як творцы больш-менш вядома на Беларусі з 1958 года, калі ўпершыню ён убачыў свой матэрыял на старонках "Гродзенскай праўды". Сёння ж на рахунку яго каля 50 кніг на самыя розныя тэмы, а найбольш — пра мастацтва і мастакоў. Яны ўбачылі свет не толькі на радзіме, але і ў Маскве, Кіеве, Вільнюсе, а затым і ў Францыі, Германіі, Індыі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Балгарыі ды іншых дзяржавах больш чым на 20 мовах свету.

Нарадзіўся мастацтвазнаўца, як сведчаць афіцыйныя дакументы, 10 красавіка 1940 г. на хутары Падгорны, што на Варонежчыне, у Расіі, з 15 гадоў вучыўся ў г. Гродна ў СШ № 7, хадзіў у літтурток пры "Гродзенскай праўдзе"...

У 1965 годзе скончыў Ленінградскі дзяржаўны універсітэт, пасля якога трапіў у Мінск, дзе праславіў сябе як мастацтвазнаўца, мастацкі крытык, рознабаковы і цікавы журналіст. Член Беларускага саюза мастакоў з 1970, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, двойчы лаўрэат Нацыянальнай прэміі "За духоўнае адраджэнне". З 1994 года працуе ў газеце "Культура", друкаваўся і ў "ЛіМе".

Для чытачоў, да юбілею творцы — вось гэтая размова з ім.

— Хто былі і ёсць для вас вялікі мастакі Л. Шчамялёў і А. Кішчанка?

— Блізкія сябры, аднамыснікі, амаль "духоўныя браты". Іх творчая дзейнасць пачыналася на маіх вачах — у 60-я гады: майстэрня Леаніда Шчамялёва тады знаходзілася над банкам па Ленінскім праспекце, супраць ДУМа (ГУМа), а майстэрня Аляксандра Кішчанкі — "Вежа смерці" — над кафэ "Вясна" (вугал праспекта і вул. Камсамольскай) — амаль побач. Словам, лепшыя іх творы нараджаліся на маіх вачах, у тым ліку шчамялёўскія "Маё нараджэнне", "Генерал Даватар", "Нядзеля", "Няміга-42", "Канікулы", партрэты; кішчанкаўскія — "Дзяўчына з кавуном", "Дзяўчына са сланечнікам", "Скульптар"...

Гэта быў час жартаў, розыгрышаў і... раздраяў. Праз яго прайшло шмат творцаў, але разам з тым усё гэта не перашкаджала, як ні дзіўна, таленавіта ствараць і рабіць нешта радыкальна новае, свежае, арыгінальнае і ў вобразнай структуры карціны, і ў жывапісным пластычны, і ў каларыце, і ў распрацоўцы прасторы.

Я ганаруся тым, што на маіх вачах яны выраслі ў вялікіх мастакоў. 40 гадоў — тэрмін немаленькі для таго, каб з годнасцю і па-справядлівасці ацаніць іх уклад у нацыянальную культуру.

Вельмі шкадую, што за дзень да смерці Сашы (Кішчанка, як і Крэпак, нарадзіўся на Варонежчыне. — **М.М.**) я не змог прыехаць да яго дамоў, хоць ён прасіў мяне аб гэтым. Перанёс свой "візіт" на наступную раніцу — але было ўжо позна: 11 лістапада 1997 года Саша памёр...

— Мой "залаты час" найбольш звязаны з Савецкай Арміяй, у якой праслужыў 27 гадоў, але былі свае радасці і ў Парэцкім дзіцячым доме № 2 на Гродзеншчыне, і ў Ашмянскай школе-інтэрнаце... А ў вас?

— Залатыя часы жыцця — дзяцінства. Яно "ўвайшло" ў мяне разам з прыродай Ціхага Дона, разам з кнігамі Джаваньёлі, Верна, Дзюма, Сцівенсана, Дэфо, з "трафейнымі" фільмамі, дзіцячымі марамі стаць "падарожнікам" тыпу Марка Пола, Магелана, Васка дэ Гама, "пісьменнікам", "мараком", пазней — "кінематаграфістам (сцэнарыстам)" і г.д.

Усё бывае ў жыцці: у дзяцінстве ледзь не патануў, але выратавала жанчына, што выпадкова праходзіла міма, аднойчы ледзьве не забілі ў бойцы...

Аднак у цэлым лёс спрыяў мне, і мае анёлы-захавальнікі прыхільна прывялі за руку да 65-годдзя. Дзякуй і Людміле (Людміла Крушынская — колішні супрацоўнік "ЛіМа", сёння галоўны рэдактар газеты "Культура" і жонка Б. Крэпака. — **М.М.**): без яе жыццё склалася б зусім інакш — не ў лепшы бок.

— Апошняе пытанне: ці ёсць "грахі" ў вашай творчасці?

— Спадчына вялікая. Толькі кніг, альбомаў, брашур ды іншага каля паўсотні, але не ўсё ўдалае. Некаторыя рэчы пісаў без асаблівага натхнення, без асаблівай любові да "аб'екта" даследавання. Такіх выданняў няшмат, але яны ёсць: гэты грэх адчуваю і патрабую ад сябе большай дасканаласці ў працы.

Міхась МАЛІНОЎСКІ,
правадзейны член Геаграфічнага таварыства.

На здымку: Барыс КРЭПАК

ЗАХАРАВА, 19

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"; e-mail: minsk@lim.by
Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва» прымае да разгляду:

выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;
выданае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг;
арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.

Вул. Захарава, 19,
тэл.: 284-66-71.

Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць № 02330/0056810 ад 2 сакавіка 2004 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Terra incognita

(Заканчэнне. Пачатак на стар.9)

ўчастка, звычайнага якога-небудзь доміка, чырвоным гонтам крытага. І сказаць... Што сказаць? Справа нават не ў мове, хоць і гэта важна (французскую трэба было вучыць, а не ўрокі прагульваць, у кустах каля школы пакурваючы!). Што сказаць? Што я хачу жыць у вашай Францыі? Таму што ў Беларусі жыву бедна? Дык хто табе вінаваты? Пры чым тут французы? Што раман не пішацца? І гэтаму Францыя не паможа. Што кніжка вось ужо амаль сем гадоў не выходзіць у «Мастацкай літаратуры»? Дык яшчэ паўдня давядзецца беднаму, успацеламу жандару тлумачыць, што гэта за дзяржаўнае выдавецтва такое, і чаму там існуе чарга, і што гэта за такія заказы, якія павінны збіраць пісьменнікі, — а самае галоўнае, калі шчыра, і добра, што яна не выходзіць. Усё да лепшага.

...Цурчэла вада і ціктакаў на руцэ гадзіннік, вяртаючы ў рэальнасць. Усяму быў час, і фантазіям таксама...

А вось другі выпадак. Больш сур'ёзны. Як вядома, маршрут «Літэкспрэса» пралягаў і праз Беларусь, г.зн. мы пабылі ў родным горадзе і паехалі далей (ніяк не маглі разабрацца з гэтым «еўрапейскім» зігзагам мінскія сябры — я быў ужо ў Берліне, а мне на кватэру ўсё яшчэ званілі, каб павіншаваць з прыездам, і дзіваваліся жончынаму адказу, што ён зноў паехаў, а калі я нарэшце вярнуўся, то ўжо асцярожна перапытвалі: цяпер можна віншаваць? на гэты раз назусім?). Дык вось, пасля Мінска я змяніўся. Нейкай не такой падалася мне радзіма. Інакш і быць не магло.

Мая краіна аказалася адзінай з усіх, якія мы наведалі, дзе людзі не размаўлялі на роднай мове. Калі тут жывеш, дык з гэтым звыкаешся і не заўважаеш, але калі вяртаешся аднекуль, гэта проста шакіруе. Пасля Беларусі і да нас, яе прадстаўнікоў, пачалі інакш ставіцца. Гэта кідалася ў вочы. І наскрозь фальшывым падавалася любаванне «сінявокай», а жалезны, сабе ў апраўданне, довад, што «вось Беларусь бедная, а накарміла!» непрыемна было слухаць — бо нельга хваліцца беднасцю, а калі ўжо корміш, дык нельга ўпікаць гэтым, ды яшчэ спасылаючыся на выдаткі, якіх гэтая «гасціннасць» каштавала /.../.

Тэма «кармёжкі» ўзнікне і ў Брэсце, засланіўшы сабою не менш важны эпізод — чалавека ў форме капітана пагранічных войск Рэспублікі Беларусь, які з асалодай маньяка, уголас, каб усе чулі, даказваў, «что такой нации, как белорусы, нету, не было и быть не должно»! Даказаць гэта было справай яго жыцця. Ненармальныя вочы яго зацята свяціліся, ён быў повен рашучасці, ён гатовы быў адстойваць сваю праўду — тое, што яго не існуе — са зброяй у руках! А мы стаялі, як апляваныя, тры пісьменнікі (В.Іпатава, Л.Дранько-Майсюк і я), якіх таксама не павінна было існаваць... Аднак тэма таможні патрабуе працягу. Ці, лепш сказаць, заключнага акорда. Гэта калі вярталіся з Германіі цягнікам «Берлін — Масква», і сусед наш па купэ, адстаўны ваенны з Баранавічаў (ездзіў у Германію ў госці да дачкі, вёз ад яе падарунак — электрапілу), як пра самую будзённую рэч папярэджваў, ужываючы такое словаспалучэнне: «Будзе шмон!» Яшчэ стаялі перад вачыма карціны Луўра, яшчэ не адзвінела ў вушах музыка Шапэна, якога слухалі ў Жалезнай Волі пад Варшаваю... "Буря! Скоро грянет буря!"

— Будзе шмон!

Мытню праязджалі позняй ноччу. Я спаў і прачнуўся ад штуршка ў бок і немага жаночага крыку: «Мужчина, вас же ждут все на коридоре!!!» Нацягваючы хутчэй джынсы, па інерцыі прамармытаў: «Я праехаў усю Еўропу і нідзе мяне соннага не штурхалі ў бок і не падымалі голага», — на што атрымаў лагічны адказ:

— У нас не Европа, слава Богу!

/.../

Але да вяртання яшчэ так далёка! Пакуль што мы стаім у Брэсце, слухаючы капітана-самаеда, наперадзе яшчэ цэлы тыдзень Еўропы. Калі выязджалі з Варшавы на Берлін, над цягнікам сабралася хмара, чорная, як ноч. Цяжка было дыхаць, то цягнула ў сон, а то пачынала балець, расколвацца галава... І толькі ў Франкфурце-на-Одэры, дакладна, як па заказе супаўшы з уездам нашым на тэрыторыю Германіі, неба прарвалася. Яго шаблямі крыжавалі маланкі; трашчаў гром, ліў, бы з вядра, дождж, і праз яго, як праз чыста вымытую шыбіну, бачны былі машыны на вуліцах і рознакаляровыя графіці на сценах і платах — гэтая візітная картка Еўропы... І следу не засталося ад галаўнога болю! І радасна, і лёгка дыхалася гэтым азонам і электрычнасцю насычаным паветрам. І ззаду, ззаду заставалася ўсё тое глупства, уся тая хлусня, усе тыя спрэчкі пра «любоў да народа», ды пра «хаджэнне ў яго», ды пра «падняцце яго да свайго ўзроўню» — уся тая ахінея, якую спецыяльным законам трэба забараніць ужываць пісьменніку (калі ён сапраўды пісьменнік) – пад страхам пажыццёвага адлучэння ад літаратуры /.../; усё тое, ад чаго хацелася заплюшчыць вочы, закрыць далонямі вушы і бегчы, уцякаць — «як уцякаў Мапасан ад Эйфелевай вежы, што давіла яму на мазгі сваёй пошасцю» (А.Чэхаў)...

— Гледзячы ў які бок ён уцякаў, — нечакана заўважыла на гэта Інга-Ліна Ліндквіст (нашая шведка, з якой мы ледзь-ледзь адшукалі на кладах Манпарнаса занядбаны, бедны прамакутнічак з паўметровым пастаменцікам, заціснуты шыкоўнымі магіламі больш знатных парыжан; памятную дошчачку, на якой штосьці было, відаць, напісана, з пастамента даўно нехта свіснуў — засталіся адно чатыры сіратлівыя дзіркі ў бетоне, а на самой магілцы — кусцік чахлых, ссохлых ружаў).

— Гледзячы куды ён бег ад гэтай вежы: ці на Parc du champ de Mars, ці праз мост на Place du Trocadero, што яшчэ пашлей за Эйфелеву вежу.

Загадкава неяк сказала Інга-Ліна.

/.../

Канечне, я вярнуўся з паездкі іншым. Я ведаў, што такім вярнуся. Нават «замарозіў» свой раман, баючыся, што змянюся настолькі, што магу знішчыць раней напісанае. Але галоўнае — паездка гэтая нейкай мяжою пралегла паміж мной і блізкімі сябрамі. Спачатку я расказваў узахлёб (не здагадваючыся, якую шкоду раблю кожным словам гэтаму вось будучаму эсэ): пра Штэфана, пра паэта ў парыжскім метро, які чытаў вершы, і калі яму падавалі, гаварыў «мерсі», а калі не падавалі — «мерсі боку!», пра мытнікаў і Мапасана, пра «эх, Мадрыд...». Потым пачаў расказваць неахвотна, толькі калі пыталі. Урэшце замоўк зусім. Я ўбачыў, што маіх субяседнікаў больш за ўсё цікавіць адно: чаму менавіта ты туды патрапіў? (Закругляецца ўжо згаданая ў пачатку «тэма выбару») Усё да болю нагадвала знакамітую булгакаўскую сцэнку двух драматургаў. «Я, брат, дваццаць пяць гадоў пішу, — уздыхаў адзін, — аднак вось у Сафоклы не выйшаў». А другі адчувае, што сказаць яму на гэта няма чаго. Адказаць так: «Не выйшаў, таму што ты пісаў кепска, а я добра?» Можна так сказаць?

«Можна?» — перапытаем і мы ўслед за аўтарам.

Усё было зразумела. Гэтае эсэ-ўспамін трэба хутчэй канчаць. Перада мной ляжыць папка з недапісаным раманам, якая так просіцца ў рукі, любімая... Зараз я пастаўлю кропку і развяжу чырвоныя матузкі... І раптам лаўлю сябе на думцы, што паўтара месяцы гэтай небывалай вадроўкі прысніліся мне. Канечне, не ў тым інжэ-паэтычным значэнні, якое ніякіх адносінаў да паэзіі не мае, а ў канкрэтна-празаічным — што ўсё, на жаль ці на шчасце, забываецца. Як і сны. Пара прачынацца. У шыбіну сумнымі кроплямі стукаецца беларуская восень. Наперадзе яшчэ адзін, падараваны нам Богам, цэлы дзень.

Кастрычнік 2000 года, г. Мінск.

Кнігі можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці: 284-66-71; (факс) 284-82-04.

Гомельскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў выказвае глыбокае спачуванне паэту Генадзю Васільевічу ГОВАРУ з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці маці.

У дворыку, каля хаты, расце дзіўнае дрэва. Грэцкі або, як кажуць палешукі, "валоскі" арэх — рэдкасць нават для тых паўднёвых краёў. Калі я прыязджала да бабулі ўвосень, заўсёды збірала гэтыя шурпатыя, падобныя да вялізных зор, плады, лушчыла, акуратна даставала сяродку, каб не раструшчыць, бо здавалася мне, што гэта — зародак жыцця чалавечага, увасабленне патаемнай повязі людскога роду, камячок сонечнай энергіі, існасць.

ВУЗЕЛЬЧЫКІ бабулінага дрэва

Пра гэта думаю заўсёды, калі ўспамінаю вёску майго дзяцінства — Туры. Назва гучная, можа, залішне лаканічная і нават крыху грубаватая, але я палюбіла яе. Чуюцца перагукі са старажытным Туравам, які знаходзіцца за 40 кіламетраў ад родных мне мясцін. Я думаю, што назва гэтая агульнабеларуская, бо, калі ехаць з Ляхавіч на Баранавічы — сустрэнеш Туркі, а на Гродзеншчыне — Турэц, ёсць і хутар Турское, што непадалёк ад Давыд-Гарадка. Паводле падання, у аснове назвы маёй вёскі — найменне старажытнай дзікай жывёлы: туроў калісьці было багата ў тутэйшых лясах. У маім уяўленні тур, як і зубр, магутны, велічны — сімвал зямлі беларускай. Можа, таму і людзі, якія спрадвеку жылі ў гэтых мясцінах, вызначаліся вальналюбствам і незалежнасцю. Гэта бачна нават з назваў архіўных дакументаў, якія захоўваюцца ў калгасным музеі. Прывяду ў прыклад некаторыя з іх: "Перечень претензій крестьян Туры и Хорск к арендатору за 1849 год", "Ведомость уплаты податей, учёта недоимок податей, отработки барщины по деревням Туры, Хорск за 1858 год", "Указание Главного управления имениями князя Виттенштейна старшине Лядецкой волости об отказе крестьян деревни Туры, Мозырского уезда, ликвидировать пожар помещичьего леса и их наказание от 14 ноября 1862".

Музей калгаса "17 верасня" захоўвае гісторыю маёй вёскі. Менавіта ў Турах у сакавіку 1940 была арганізавана першая калектыўная гаспадарка раёна. Яе ўзначаліў мой знакаміты зямляк Андрэй Трухановіч. Прыкметнай асобай у складзе праўлення першага калгаса быў і Ігнат Патрубейка, тройчы георгіеўскі кавалер, член рэвалюцыйнага камітэта вёскі Туры. За калгасам замацавалі 250 гектараў ворыўнай зямлі, 400 — сенакосаў, 200 — адгоннай пашы.

Першым мясцовым трактарыстам стаў Уладзімір Патрубейка. Калі фашысты акупіравалі раён, ён разабраў свой "ХТЗ" і закапаў. Пасля вызвалення аднавіў і працаваў на ім да пенсіі. Знакаміты "капітан" (так любоўна называлі гэты трактар мясцовыя жыхары) устаноўлены на ганаровым п'едэстале ў Пінску.

Ёсць тут свая гісторыя ўсяму: кожнай рэчачцы, балотцу, сенажаці. Дзядуля, памятаю, казаў: "Паедзем сёння на "Болонне" (якая незвычайная назва!). Ці: "Я "броднік" (рыбалоўная прылада) паставіў у Луцэ". Лука — самая маленькая з мясцовых рэчак, а далей — усім вядомыя Гарынь і Прыпяць!

Раней многія прыбярэжныя вёскі былі звязаныя паміж сабой рознымі пратокамі, азярынамі і іншымі натуральнымі вадаёмамі. Такая вадзяная дарога называлася звычайна "ездой" або "яцелем". Дарэчы, мяне заўсёды здзіўляе і ўсцешвае гучная, адметная і сакавітая палеская мова. Бабуля казала: "У нас у городзі і под плотом столькі броківу наросло" ("броківа" — крапіва). Ці: "Гатку робяць, шчоб воду одбівало, не подмувало берэг" (гатка — пляцень, якім умацоўваюць бераг ракі).

Я зноў у думках вяртаюся не толькі на тыя берагі, але і да любай "хатачкі з далонькаю двара", як сказаў паэт, наш, дарэчы, зямляк Леанід Дранько-Майсюк. На покуці, ля абразоў адбіваў час вялікі старадаўні гадзіннік. (Дзядуля набыў яго яшчэ да вайны). Спачатку ён неяк напружваўся, бы збіраўся з сілаю, шыпеў, а потым чулася гэтае адвечнае: "Бом-бом-бом!.."

Вечарамі дзядуля з бабуляй уладкоўваліся каля грубкі глядзець тэлевізар, вельмі любілі фігурнае катанне, да нейкіх неверагодных тонкасцяў, перажывалі за кожны недарэчны рух і, крый Божа, падзенне спартсмена, часта чулася: "Ай! Божухна!.."

А то часам даставаў дзядуля з вялікага чорнага футарала свой трафейны нямецкі акардэон, падбіраў мелодыі вядомых песень, усё больш задушэўна-лірычных, бабуля спрабавала падпяваць — і адбывалася гэткае ні з чым не параўнанае хараство раптоўнасці!

Ніколі не забудуся пра ваяжы з дзядулем у мясцовую краму, на яго знакамітым трохколавым матацыкле. Дзед вельмі ганарыўся сваёй "машынай", бярог, як любімую цацку, і толькі мне дазваляў патрымацца калі-нікалі за руль. У краме мы куплялі з ім цукеркі, вафлі, іншыя прысмакі, і ў тыя хвіліны я адчувала сябе найшчаслівейшым чалавекам!..

Некалькі гадоў таму маіх дзядулі і бабулі не стала. Састарэла цяпер і хата, і калодзежны журавель ля замшэлага тыну, і ганак, і веснічкі...

Хто раскажа пра гаспадара,
хто паведаміць аб гаспадыні
хатачкі з далонькаю двара,
з комінам,
што нудзіцца па дыме...

У дворыку, каля хаты, расце дзіўнае дрэва... Здаецца я ведаю кожны вузельчык на яго галінках, кожную расколінку на стромкім ствале, кожную драпінку, адчуваю своеасаблівы пах яго лісця, чую яго таямнічы і загадкавы шэпт — спрадвечную песню майму дому, роду, Палессю. Колькі разоў я задавала пытанне маме, самой сабе:

"Чаму бабуля пасадзіла каля хаты "валоскі" арэх, а не таполю, дуб ці рабіну?!". Мабыць, яна ведала нейкі іншы сэнс, бачыла ў гэтым іншы знак, сімвал роду? Я буду берагчы яго. Я перадам усё гэта сваім дзецям, унукам. Мы будзем прыязджаць да дрэва разам. І да хаты. Бо адтуль пачатак майго жыццёвага хараства...

...І аднойчы іхніх дзён зара
вернецца да роднае святыні,
І раскажа пра гаспадара,
І паведаміць аб гаспадыні.

Ірына ГРЫГАРАН

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе
ўзнагароджаны ордэнам
Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР

Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ
(в. а. намесніка галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ,
Янка ЛАЙКОЎ,
Ірына ШАЎЛЯКОВА,
Наталля ЯКАВЕНКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны
рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага
рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай
думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця,
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно
і выяўленчага
мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Пры перадруку просьба
спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя
не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі
можа не супадаць
з меркаваннямі
і думкамі аўтараў
публікацый.
Набор і вёрстка
камп'ютэрнага цэнтра
РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень
па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага
унітарнага прадпрыемства
"Выдавецтва
"Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 3036
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк
27.04.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая
ўстанова
"Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае
пасведчанне № 715
Заказ — 501

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2005 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 22800 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 3300 руб.
на 3 месяцы — 9900 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21000 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 3200 руб.
на 3 месяцы — 9600 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 3 месяцы — 12600 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21000 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 3500 руб.
на 4 месяцы — 7000 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 4500 руб.
на 4 месяцы — 9000 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 11400 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 3200 руб.
на 3 месяцы — 9600 руб.
Ведамасная (індэкс — 749682)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 3 месяцы — 12600 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на месяц — 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21800 руб.